Анджэй Пачобут ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Археолаг Сяргей Дубінскі ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 14 (28613) Год LVI | Беласток, 3 красавіка 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

ДЗЕНЬ ВОЛІ — 93-Я ЎГОДКІ

Канцэрт гродзенскага хору „Бацькаўшчына" транслявацца ў жывым эфіры Радыё Рацыя

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Беластоцкае адзначанне Дня Волі ў Беластоку сарганізавалі супольна Беларускі саюз у Рэчы Паспалітай, тыднёвік беларусаў у Польшчы „Ніва" і Радыё Рацыя. 25 сакавіка беластачане, гайнавяне, бялыстачане і госці родам з іншых мясцін Падляшша сабраліся на ўрачыстую вечарыну ў зале „Сподкаў. Урачыстая частка святкавання пачалася з супольнага выканання гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі".

Яўген Вапа, старшыня Беларускага саюза ў Польшчы, адзначыў, што сёлетняе святкаванне Дня Волі праходзіць у асаблівых умовах: „Думаю, што ў той момант, калі гэтыя ўгодкі даводзіцца нам святкаваць, у момант пасля снежаньскіх выбараў у Беларусі, наша шматлюдная прысутнасць будзе доказам таго, што мы, як беларусы, умеем шанаваць сваю мінуўшчыну ды ўмеем быць салідарнымі ў гэты дзень — незалежна ад таго, хто дзе пражывае ў свеце. Сустрэчы з нагоды Дня Волі з'яўляюцца нагодай для згадкі пра людзей нашага старання, прысвяціўшых сваё жыццё і таленты дзеля Айчыны. Сёлета на мерапрыемстве выступіў прафесар Алег Латышонак з дакладам пра першага прэм'ер-міністра ўрада БНР Язэпа Варонку (1891-1952), ураджэнца Сакольшчыны, беларускага палітычнага дзеяча, журналіста, сябра Беларускай сацыялістычнай грамады, камісара юстыцыі і ўнутраных спраў Вялікай Беларускай Рады (1917), старшыні і міністра замежных спраў Народнага Сакратарыята БНК, аднаго з ініцыятараў абвяшчэння БНР. Быў ён дэлегатам I Усебеларускага кангрэса, першым старшынёй Народнага Сакратарыята Рады БНР. Быў прыхільнікам саюза з Літвой. Са снежня 1918 г. па красавік 1920 г. быў міністрам беларускіх спраў пры ўрадзе Літвы. З 1923 г. жыў у Чыкага, займаўся грамадскай працай, быў адным з заснавальнікаў Беларуска-Амерыканскай Нацыянальнай Рады.

Пасля госці святочнай вечарыны паглядзелі дакументальны фільм Юрыя Каліны і Ганны Кандрацюк, прысвечаны іншаму выхадцу з Сакольшчыны кампазітару Яну Тарасевічу. У другой частцы святкаванняў прагучаў канцэрт патрыятычных песень у выкананні гродзенскага хору „Бацькаўшчына".

Традыцыйныя бел-чырвона-белыя букеты за асабісты ўклад у беларускую справу сёлета былі ўручаны дырэктару дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Падляшскай Маршалкоўскай управы Анатолю Вапу, старшыні аб'яднання „Тэра Інкогніта" з Крынак Іаанне Чабан і настаўніцы Валянціне Бабулевіч з бельскай „тройкі" — школы найлепш ацэненай у ваяводстве:

— Усе напэўна ведаем, якую важную ролю ў быцці беларусам Беласточчыны адыгрываюць людзі, якія штодзень займаюцца адукацыяй, асветай, культурай, — адзначыў старшыня БС Яўген Вапа, уручаючы кветкі лаўрэатам.

— Гэтая ўзнагарода цудоўная і блізкая сэрцу, але я думаю, што яна не толькі для мяне адной, але для ўсіх настаўнікаў беларускай мовы ў маёй школе і наогул усіх настаўнікаў. Я менавіта так успрымаю гэтую ўзнагароду, — сказала Валянціна Бабулевіч.

— У мяне і без узнагароды дастаткова многа матывацыі для далейшай дзейнасці, але гэта вельмі прыемна. Прыемна тут тое, што я адчуваю сябе не адна, што людзі не забываюць аба мне і я веру, што ў цяжкія моманты яны будуць заўжды са мною, — сказала Іаанна Чабан.

Злева: Валянціна Бабулевіч, Іаанна Чабан і Анатоль Вап

— Гэта мая штодзённая праца, я толькі выконваю свае штодзённыя абавязкі. Калі асяроддзе гэта бачыць і ацэньвае менавіта так, дык гэта і вельмі добра, і прыемна, — сказаў Анатоль Вап.

У Беластоку ў наступныя дні працягваліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да 93-х угодкаў абвяшчэння БНР. У суботу а 18-й гадзіне ў Фарным касцёле прайшла малітва за Беларусь, за развіццё беларускай культуры і мовы і за добрыя суседскія адносіны, а ў клубе „Лёфт" па вуліцы Мальмеда адбыўся канцэрт у рамках мерапрыемстваў пад назвай „Салідарныя з Беларуссю". Перад канцэртам прайшоў Марш Свабоды. Праведзены былі таксама мерапрыемствы ў беларускіх ліцэях у Гайнаўцы і Бельску, а таксама ў далёкім Гданьску.

Святочныя імпрэзы адбыліся, між іншым, у Празе, Нью-Йорку, Нью-Брансвіку, Нью-Джэрсі. Беларуская апазіцыя не змагла адзначыць Дня Волі ў Мінску ў запланаваным фармаце. Сілавікі не дазволілі моладзевым арганізацыям правесці шэсце ад плошчы Якуба Коласа да сквера Янкі Купалы. Перад святкаваннем Дня Волі былі затрыманы больш сямдзесяці чалавек. Частка з тых, хто быў затрыманы прэвентыўна, ужо вызвалены. На некаторых былі складзены пратаколы, а пра частку затрыманых пакуль няма звестак. У рэгіёнах былі затрыманы 18 чалавек, у тым ліку Уладзімір Лапцэвіч з Магілёва, карэспандэнт „Нівы".

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла напісала: „Хачу нагадаць вам словы вядомага беларускага святара а. Аляксандра Надсана: „На долю беларусаў выпала шмат цяжкіх выпрабаванняў. Колькі разоў, здавалася, яны стаялі на краі загубы. Тое, што нягледзячы на ўсё яны выжылі, сведчыць аб вялікай духовай сіле нашага народу". Сёння гэтая духовая сіла ўвасабляецца ў тых дзяўчатах і хлапцах, жанчынах і мужчынах, што дзесяткамі тысяч выйшлі на Плошчу 19 снежня, і ў тых людзях, якія актыўна ўключыліся ў кампанію салідарнасці з вязнямі рэжыму і якія выступаюць з патрабаваннем новых — сумленных — выбараў. Яны не дазволяць, каб Беларусь, незалежная беларуская дзяржава, загінула. Спробы дыктатара запалохаць людзей прымяненнем супраць іх збройнай сілы скончацца ягонай паразай. Краіна наша выстаіць і зойме сваё годнае месца між дзяржаў свету. Я моцна ў гэта веру і заклікаю кожнага з Вас далучыцца да тых новых сілаў у нашым народзе, якія супрацьстаяць варожым нам ідэалогіям і менталітэту. Разам мы пераможам усе цяжкасці на шляху да волі і дабрабыту.

Жыве Беларусь!".

Што рабіць?

Шчаслівы той, хто ведае, што рабіць. Тады чалавек складае планы, будуе графік іх рэалізацыі, штодзённа над нечым працуе, каб наблізіцца да пастаўленай мэты. А вось чым заняцца чалавеку, які не ведае, што яму рабіць? А калі гэта цэлы ўрад, або нават усё кіраўніцтва краіны? Аналізуючы дзеянні беларускай улады за апошні перыяд, прыходзіш да трывалай высновы, што людзі не толькі не маюць нейкай яскрава акрэсленай мэты, да дасягнення якой праз працяглы перыяд мусіць імкнуцца краіна, але нават не спрабуюць зрабіць больш-менш зразумелага сцэнара хаця б на заўтра ці пасляпасляўтра.

То абвяшчаецца шматвектарная палітыка, то ўсходняя, якая рэзка мяняецца на збліжэнне з Захадам. І на думку таго Захаду, у Беларусі адбываецца ледзь не абвяшчэнне курсу на дэмакратызацыю палітычнага жыцця і лібералізацыю эканомікі, якія мусяць здзейсніцца нейкім неверагодна дзіўным чынам, якога яшчэ не ведала гісторыя — па загадзе аднаго чалавека!

Але такая дэмакратызацыя скончылася хутчэй, чым пастаўкі венесуэльскай нафты, і цалкам прадказальна для беларускай апазіцыі. Штошто, а рабіць дакладныя прагнозы апазіцыя даўно навучалася. Таму зрабіць прадказанні наконт таго, калі будуць лупцаваць і садзіць за адсутнасць сімпатый да „шматвектарнага" курсу, апазіцыя таксама ўжо даўно ўмее беспамылкова. Калі хто не разумее, навошта ж тады, усё ведаючы, яна сама суне галаву пад удары, то няхай пачытае гісторыю Беларусі. І паспрабуе даць адказ, чаму беларусаў больш за ўсіх, у параўнанні да колькасці насельніцтва, загінула ў Другую сусветную вайну? Або чаму іх больш за іншых прыехала на радзіму ў цынкавых трунах з Афганістана? Чаму нам няма роўных па колькасці загінуўшых у чужых арміях, замест стварацъ сваю? Такая ў нас, відаць, нацыянальная рыса: спачатку ўвязацца ў бой, а пасля ўжо разбірацца, што гэта за бітва. І толькі пасля надзвычай востра ставіць пытанне: што рабіць? А ніхто не ведае. Затое ўсе думаюць, што гэта ведае нехта іншы.

Улада думае, што ў апазіцыі быў распрацаваны план звяржэння яе, улады. Пра тое сведчыць і надзвычай жорсткі разгон паслявыбарчай акцыі ў Мінску, і істэрыя масавых затрыманняў, і абсурднасць пакаранняў, і нават спалох ад анармальна мірнага святкавання Дня Волі. Апазіцыя сцвярджае, што такога плана не было. А які тады быў? А ніякага. Проста трэба было ісці і адстойваць сваю праўду. Усё па-беларуску. Калі нехта назаве гэта гандзізмам, то памыліцца. Гандзізм мае яскрава акрэсленую канчатковую мэту і дакладны план, якімі шляхамі трэба яго рэалізоўваць, і як кожны з крокаў паўплывае на свядомасць і прыхільнікаў, і праціўнікаў. Беларускі ж сцэнар гучыць проста — трэба ісці, бо трэба ісці. А што там рабіць, як прыйдзеш, разбірацца на месцы.

Зрэшты, нават Захад, які нібыта ўсё ведае, у гэтай сітуацыі таксама не ведае, што рабіць. Бо Беларусь не Лівія, дзе можна забараніць наземную аперацыю ўзамен на паветраную. Бо ў Беларусі няма чаго бамбіць. Нічога не збудавалі ні на расійскія, ні на заходнія крэдыты. Сітуацыя патавая.

Адзін Пуцін думае, што ён ведае, што рабіць. Але як заўсёды памыляецца. Бо акрамя імклівага продажу нафты, газу, лесу і іншых багацяў расійскага народа, у яго анічога не атрымалася ні ў самой Расіі, ні за яе межамі. Ён думае, што гэтая ўлада аддасць яму незалежнасць краіны, бо не мае іншага выйсця. Але для тых, хто за апошнія гады пабагацеў, дзякуючы блізасці да ўлады, гэта таксама не выйсце. Бо яны добра ведаюць, што як пахіснецца незалежнасць, то назаўтра з Расіі прыедуць „браткі" і зробяць перадзел маёмасці хутчэй, чым сваякі пахаваюць раптоўна загінуўшых нядаўніх уладальнікаў гэтай маёмасці.

Вось і атрымліваецца, што на пытанне „што рабіць?" ніхто не ведае адказу. Застаецца толькі спадзявацца, што ўсё будзе па-беларуску. Гэта калі ніхто не ведае што рабіць, але ўсе зробяць так, як трэба.

Віктар САЗОНАЎ

Беларуская выдзіманка

Тое, што вырабляе Аляксандр Лукашэнка пад бокам напышліва дэмакратычнай Еўропы, проста ў галаве не месціцца. Ён з яе кепікі строіць. Тра-ра-ра! Вось у сталіцы цывілізаванага народа катуюць апазіцыянераў рэжыму. Прашу вас уявіць эмпатычна — КАТУЮЦЬ! І што на гэта Еўропа? А напамінае і плануе санкцыі, якія, паводле прынцыпу „лес сякуць — трэскі лятуць", ударацъ ашчэпкамі ў сярэднага грамадзяніна. Бо ж не ў прэзідэнта Лукашэнку. Ды гэта яшчэ не ўсё. Таксама ААН пагражае Беларусі сур'ёзнымі санкцыямі пасля таго, як Аляксандр Лукашэнка парушыў эмбарга на пастаўкі зброі для рэвальтаваных атрадаў Ларана Гбагбо, былога прэзідэнта Кот-д'Івуара (Берага Слановай Косці). Прыгадаем, што пасля паразы на мінулагодніх выбарах адмовіўся ён пакінуць пасаду і пачаў вайну з сіламі дэмакратычна абранага контркандыдата — сітуацыя дакладна такая ж, у якой апынуўся б сам Лукашэнка, калі б у пару не сфальшаваў выбараў. Не здзіўляе ў такім выпадку яго салідарнасць з Гбагбо, які давёў да смерці дзесяткі тысяч людзей. Прытым лік ахвяр тае афрыканскае вайны, між іншым жанчын і дзяцей, гвалтоўна ўзрос, дзякуючы баявой эфектыўнасці беларускай зброі. Але Лукашэнку гэта лішне не турбуе, бо, як калісьці выпадкам прызнаўся ў тэлеэфіры БТ, гандаль зброяй — важная крыніца валюты. А валюта гэта святое. На прыватныя рахункі гандляроў зброяй банкі ж не прымаюць беларускіх рублёў.

Дзіўныя калегі ў Аляксандра Лукашэнкі. Псіхапат Уга Чавес з Венесуэлы, згаданы Ларан Гбагбо — садыст, Махмуд Ахмадзінеджад з Ірана — рэлігійны параноік, Анджэй Лепер — без слоў, афрыканскія дыктатары-зладзеі і найбольш з іх вядомы Муамар Кадафі — маніякальна-дэпрэсіўны тып! Апошні, па асабістым жаданні Лукашэнкі, атрымаў нават званне ганаровага доктара Беларускага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі ў Мінску — мабыць за навінкі. Ці не ў прымянянні катаванняў на сваіх ворагах? А паколькі ворагам яму большасць народа, дык і не стрываў на канец збалелы народ і ўзяўся за вымятанне з краіны лютага ўладара. На жаль, пры нагодзе вымеў таксама шмат золата, бо як вядома, да кожнага тырана клеіцца не толькі чалавечая кроў. Паводле заходніх разведак, прыватны самалёт Кадафі, які ўжо чатыры разы прызямляўся ў Беларусі, прывёз якраз золата ўкрадзенае лівійцам. Ну што ж, дыктатар паможа дыктатару...

Кадафі, назваўшы сябе правадыром ісламскай, і тут увага, рэвалюцыі, пачаў трактаваць дзяржаўны бюджэт як свой уласны. Лукашэнка, які абвясціў сябе бацькам беларусаў, таксама пачаў бомкаць аб рэвалюцыі, праўда, гаспадарчай, але ж... О Госпадзе! Ці ўсе рэвалюцыі мусяць канчыцца аднолькава? Апошнім беларускім экспартным гітом, апрача бульбы, штучных угнаенняў і зброі з'яўляюцца... міжнародныя аванцюры прэзідэнта. Ці маюць яны закрыць факт, што вялізныя танцьемы ад продажу нацыянальнай маёмасці трапляюць у кішэні хаўрусніка беларускага дыктатара? Ды аб гэтым ні гу-гу! А калі гэта камусьці не падабаецца, дык маюцца спосабы, каб яму заткнуць глотку.

Васілю Парфянкову здарылася, што ў час дэманстрацыі 19 снежня стукнуў раз ці два ў сцяну ўрадавага будынка, ды суддзя, разбіраючыся ў яго справе, пільна стукаючы ў свой чэрап, далічыўся 61 удара. Мусіла гэта аблакатам моцна страсянуць, бо пакараў ён вандала чатырма гадамі калоніі строгага рэжыму. Слушна, дарэчы, бо ж згаданы будынак пасля столькіх удараў пэўна падвергся поўнай дэструкцыі. Не гаварыўшы ўжо аб судзейскім чэрапе. Апрача Парфянкова ва ўдзеле і арганізацыі снежаньскіх дэманстрацый абвінавачана 41 асоба. Усе яны, мабыць, стукалі ў штосьці ў час тузаніны з міліцыяй, таму баюся, што цэнтр Мінска з-за гэтага зусім зруйнаваны. Але Лукашэнку ўсё адно. Калі што, далучыцца да лятучага каравана іншых былых дыктатараў. А Беларусь? Ну, высмактаў з яе амаль усё, дык навошта яму шкарлупка-выдзіманка?

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Салідарныя з Беларуссю

„Пачуй нас!" — пад такім лозунгам ужо пяты раз прайшла акцыя „Салідарныя з Беларуссю". Як заўсёды найбольш цікава была яна сарганізавана ў Варшаве. Апрача канцэрта можна было ўдзельнічаць у гарадской гульні, у час якой кожны мог адчуць сябе беларускім апазіцыянерам, ды паглядзець выставу здымкаў двух знакамітых мастакоў з Беларусі: Алеся Пушкіна і Міхала Анемпадыстава. Акцыя праводзілася таксама ў іншых гарадах, між іншым у Катавіцах, Кракаве і Трыгорадзе. У гэты раз не абмінула і Беластока. На жаль, пад помнік маршалу Юзафу Пілсудскаму не прыйшлі тлумы. Паявілася тут каля дваццаці, галоўным чынам, маладых людзей, якія пад бел-чырвона-белым сцягам пакрочылі адсюль цэнтральнымі вуліцамі да аднаго з клубаў, дзе зайгралі беларускія гурты. Сярод удзельнікаў удалося ўбачыць старшыню Гарадской рады Беластока Владзімежа Кусака, а ў клубе таксама віцэ-старшыню сеймавай камісіі замежных спраў і старшыню парламенцкай групы па справах Беларусі дэпутата Роберта Тышкевіча.

Яшчэ пад помнікам, дзе былі запалены знічы, прадстаўнік галоўнага арганізатара мерапрыемства Згуртавання „Маладыя дэмакраты" (моладзевая групоўка Грамадзянскай платформы) Конрад Внароўскі сказаў журналістам:

— З 2004 г. наша згуртаванне супрацоўнічае з моладзевымі дэмакратычнымі арганізацыямі ў Беларусі. Сёння такі дзень, калі так як моладзь ва ўсёй Польшчы, у Злучаных Штатах Амерыкі ці ў Літве кажам гучнае „Не!" рэжыму: рэпрэсіям, аблавам, арыштам у Беларусі. Хочам сказаць беларусам, што яны не ізаляваныя, што палітыкі, дзеячы і звычайныя грамадзяне на Захадзе стаяць за імі, каб мелі яны свядомасць, што варта змагацца за свабоду. Маю надзею, што трансфармацыя ў Беларусі наступіць хутка, хоць так як у Польшчы не абдудзецца яна з дня на дзень.

Адчытаў заклік падрыхтаваны Маладымі дэмакратамі і моладзевай Гарадской радай. Асуджаны ў ім насілле і рэпрэсіі ў адносінах да беларускага грамадства і сфальшаванне вынікаў прэзідэнцкіх выбараў, якія адбыліся ў снежні мінулага года. Спаслаўся таксама на затрыманні ўдзельнікаў Дня волі ў Мінску:

— Пры такой драматычнай сітуацыі прагнем запэўніць усіх змагаючыхся за дэмакратычную Беларусь аб нашай непахіснай салідарнасці і падтрымцы. Ніколі не астанецеся адзінокімі ў вашым змаганні.

Беластоцкая акцыя была праведзена дзень пасля ўрачыстага святкавання Дня волі. Некаторыя з удзельнікаў трактавалі яе як працяг гэтага свята.

— Я прыйшла сюды таму, што хачу паказаць сваю салідарнасць з беларускім народам і таму, што дата 25 сакавіка для мяне таксама важная, — прызналася Уршуля Шубзда з другога курса беларускай філалогіі Універсітэта ў Беластоку. Яе аднакурсніца Марта, родам з Жор у Сілезіі, якая адчувае сябе беларускай, дадала:

— Такім спосабам я хацела перш за ўсё адзначыць Дзень волі.

— Я хацеў бы, каб беларусы як народ мелі магчымасць выказваць свае погляды і пачуцці, каб маглі ганарыцца са сваёй беларускасцю. Каб былі проста вольнымі, — пераконваў Пётр Янкоўскі з Радыё Рацыя, падобна як іншыя ўдзельнікі акцыі з прышпіленым бел-чырвона-белым банцікам.

Перад канцэртам Тамаш Максімюк, сябра гурту „Scrapped Cultur", сказаў:

— Я і наш басіст лічым сябе беларусамі і прызнаем беларушчыну. На Беласточчыне жыве шмат беларусаў і мы таксама хочам чымсьці спрычыніцца дзеля свабоднай Беларусі. Падказвае нам гэта наша сумленне.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

АНДЖЭЙ ПАЧОБУТ:

ГЭТА НЕ ЭТНІЧНАЯ ПРАБЛЕМА

Са старшынёй Галоўнай рады непрызнаванага рэжымам Аляксандра Лукашэнкі Саюза палякаў Беларусі, карэспандэнтам штодзённі „Gazeta Wyborcza" Анджэем Пачобутам сустрэліся ў апошні час удзельнікі дыскусійнага клуба Згуртавання бацькоў і дзяцей, вывучаючых беларускую мову „АБ-БА". Анджэй Пачобут быў асуджаны на пятнаццаць дзён турмы за ўдзел у дэманстрацыі 19 снежня 2010 г. на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску, сарганізаванай у знак пратэсту супраць фальшаванню вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Народжаны ў 1974 г. у Вялікай Бераставіцы, а пастаянна пражываючы ў Гродне, вядучы дзеяч СПБ расказваў пра гісторыю і перыпетыі гэтай польскай меншаснай арганізацыі і яе канфлікты з уладай. Успамінаў м.інш. пра школы ў Гродне і Ваўкавыску, у якіх навучаецца польская мова і пра дапамогу ў вучобе, у якую ангажуецца СПБ:

— Наш уплыў на кіраўніцтва гэтых школ цяпер ніякі, але вельмі добры ў нас кантакт з бацькамі.

Адзначыў:

— Мэтай СПБ не было стаць палітычным элементам, палітычнай праблемай. Так, аднак, сталася, што справа СПБ была выкарыстана супраць Польшчы.

Як сцвердзіў, не ўдалося дагэтуль зарэгістраваць арганізацыі польскай меншасці пад іншай назвай, чым СПБ, якая была б канкурэнтнай для Саюза адобранага рэжымам. Гаварыў:

— Цяжка быць свабодным чалавекам у зняволенай краіне.

Пасля сустрэчы паставілі мы Анджэю Пачобуту некалькі пытанняў.

— ***Вы адчуваеце сябе палітычным вязнем?***

— Я быў пакараны несумненна па палітычных прычынах.

— ***Як да Вас ставіліся ў турме?***

— Ніякай фізічнай прэсіі ў час майго пакарання да мяне не прымянялі. Былі два моманты, калі я адчуў псіхалагічны прэсінг. Прабавалі мяне запалохаць. Калі я трапіў у турму, прыйшоў да мяне яе начальнік і сказаў, што быццам бы я ўдарыў міліцыянта, і дадаў: „Ну дык цяпер з вамі папрацуем". Пасля за тыя пятнаццаць дзён тэма пабояў міліцыянта не вярнулася. Тая інфармацыя была ўкінута, як разумею, каб мне намякнуць, што буду пакараны, каб меў я пра што думаць. Аднойчы забралі мяне з камеры з рэчамі. Думаю: ужо выйду. А тут бах — перавялі мяне ў іншую камеру. Былі элементы такога тыпу націску, ды на запалохванне не наважыліся. Думаю, што на гэта меў уплыў факт, што ў маёй справе выказаўся шэраг вядомых палітыкаў, такіх як старшыня Еўрапарламента Ежы Бузэк ці прэзідэнт Браніслаў Камароўскі. Перад гэтым арыштаваннем КДБэшнікі мяне пабілі і я баяўся, што так будзе і ў турме. Аднак, дзякуючы якраз інтэрвенцыі вядомых асоб, не дапусцілі да гэтага.

— ***Як я добра зразумеў з аднаго з Вашых выказванняў, палітвязням жывецца лепш у беларускіх турмах, чым вязням абвінавачаным за г.зв. паспалітыя злачынствы?***

— Я думаю, што генеральна так ёсць заўсёды. Палітычна зняволеныя гэта тыя, якімі цікавіцца публічная думка, займаюцца праваабарончыя арганізацыі. Мяне апекай ахапіла польскае пасольства ў Мінску, якое наняло адваката. Наведваў ён мяне ў турме. У адносінах да палітвязняў не прымяняецца ўніжанне, як, напрыклад, у адносінах да вязняў абвінавачаных у лаянцы ці хуліганстве на вуліцы ў п'яным відзе. Вязні, якія сядзелі са мною ў камеры, цешыліся, што я з імі ёсць. Ключары не дзейнічалі так жорстка ў адносінах да іх, як у суседніх камерах.

— ***Ці пакаранне і арыштаванне Вас можна трактаваць як атаку на Саюз палякаў Беларусі, непрызнаваны рэжымам?***

— Цяжка мне тут гаварыць адназначна аб прычынах, чаму 8 студзеня мяне прывялі ў КДБ, чаму мяне там тады пабілі. Функцыянеры ўспомнілі штосьці пра СПБ. Я разумею, што пасля мяне абвінавацілі і асудзілі за тое, што я, як журналіст, быў на Кастрычніцкай плошчы, а ўлады не хацелі, каб там былі тады замежныя СМІ. Пакуль у большым маштабе рэпрэсіі пасля 19 снежня не кранулі СПБ. У большым маштабе аднавілі толькі справу „Палёнікі" [фірма фінансавала дзейнасць непрызнаванага СПБ; кіравала ёю папярэдняя старшыня Саюза Анжаліка Борыс — М. Х.] і гэта ўжо 20 снежня. Больш наступальных дзеянняў у адосінах да СПБ не пачыналі. Маю надзею, што ўлады адумаліся і зразумелі, што спраў Саюза не ўдасца вырашыць пры дапамозе сілы.

— ***Як гэта адбываецца, што яшчэ нядаўна Вы былі палітвязнем, выступаючым супраць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, а, здаецца, без перашкод выязджаеце за мяжу?***

— Гэты феномен заключаецца ў тым, што Лукашэнку залежыць на тым, каб апазіцыянеры як найчасцей з'язджалі з краіны. Я меў два гады забарону выезду з Беларусі. Тады аднак я ездзіў у Польшчу праз Расію і Украіну. У сітуацыі, калі Беларусь не мае мяжы з Расіяй, такога тыпу забароны непаспяховыя. Даказаў гэта ў апошні час м.інш. апазіцыйны кандыдат на прэзідэнта на снежаньскіх выбарах Алесь Міхалевіч. Хоць яго пашпарт адабраў КДБ, прабывае ён у Чэхіі. Тое, што Лукашэнка не можа прымяняць такіх метадаў у гэтай справе як на Кубе — вынік інтэграцыі з Расіяй.

— ***Як Вы мяркуеце, чаму прэзідэнт Лукашэнка не падпісвае дамовы аб малым памежным руху з Польшчай?***

— Гэта нявыгаднае для беларускіх улад. Справа ў тым, што ў Беларусі наглядаецца перавытворчасць халадзільнікаў, тэлевізараў і розных іншых тавараў. Харчавая вытворчасць даражэйшая, бо яна вырабляецца ў калгасах, а там, дзе ёсць калгасы, няма канкурэнцыі. Ведаю шмат людзей, якія частку сваёй зарплаты мяняюць на долары і прыязджаюць у Беласток на пакупкі ў супермаркетах. У выніку таго беларускія ўлады трацяць спажыўцоў. Малы памежны рух (МПР) мог бы яшчэ больш інтэнсіфікаваць гэтую тэндэнцыю. Думаю, што Лукашэнка будзе вельмі адцягваць падпісанне гэтай дамовы. Прыкладам з'яўляецца сітуацыя з Украінай. Тут памежныя справы не рэгуляваліся ад абвяшчэння незалежнасці гэтай краінай у 1991 годзе. Лукашэнка будзе адцягваць падпісанне дамовы аб МПР з Польшчай, пакуль не будуць рэгуляваны гаспадарчыя справы ўнутры Беларусі, якія паўплываюць на тое, што Беларусь будзе больш адкрытая на заходнія тавары і не будзе гэта такая сацыялістычная гаспадарка, якая абапіраецца на практэкцыянізм.

— ***Ці Аляксандр Лукашэнка баіцца Польшчы і палякаў?***

— Аляксандр Лукашэнка выглядае на асобу, якая баіцца шмат чаго, ён ахоплены страхам. Аб страху сведчыць гвалт, які прымяняецца ў адносінах да апазіцыйных дзеячаў ці незалежных журналістаў. Польская меншасць у Беларусі, але і беларуская меншасць у Польшчы і іншыя меншасці генеральна зацікаўлены ў тым, каб у краінах іх пражывання жылося ў згодзе. Кожная меншасць служыць таму, каб адносіны паміж краінамі былі лепшымі. Аднак у Беларусі сітуацыя склалася так, што польская меншасць стала заложнікам жорсткай палітыкі ў адносінах да ўсіх няўрадавых арганізацый. З 2005 г. праблема польскай меншасці ў Беларусі гэта не этнічная праблема, а праблема стасунку ўлад да адкрытага грамадства. Наш Саюз быў дэлегалізаваны і была перанята яго маёмасць таму, што СПБ хацеў вырашаць сам аб сабе, аб тым, хто будзе ім кіраваць. Улады хацелі, каб кіраваў ім хтосьці іншы, і гэта з'яўляецца падставай канфлікту.

— ***Ці пасля здарэнняў, звязаных са снежаньскімі прэзідэнцкімі выбарамі, паспяховымі з'яўляюцца санкцыі, якія прымяняе ЕС, м.інш. і Польшча, у адносінах да Беларусі?***

— Перш за ўсё ЕС не ўпускае на сваю тэрыторыю асоб, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў рэпрэсіях [на сёння гэты спісак ахоплівае 158 чалавек — М. Х.]. Я не хацеў бы, каб у маю краіну ўязджалі асобы звязаныя з уладай, якая праследуе жыхароў іншых краін. І думаю, што кожны нармальны еўрапеец таксама не хоча, каб яго краіну наведвалі людзі, якія праследуюць журналістаў ці саджаюць у турму палітыкаў. Гэта нармальныя рэакцыі на здарэнні, якія мелі месца ў Беларусі. Вядома, няма чаго абманвацца тым, што факт таго, што 158 чалавек не выедзе з Беларусі ў краіны ЕС, спрычыніцца да нейкага перавароту, паўплывае на нейкія сур'ёзныя змены ў беларускім грамадстве. Але разумею гэтае рашэнне і яго падтрымліваю.

— ***А можа, як ставяць справу некаторыя еўрапейскія палітыткі, у рамках рэакцыі на снежаньскія і пазнейшыя рэпрэсіі, павінны быць уведзены палітычныя санкцыі?***

— Я лічу, што не трэба падтрымліваць рэжыму Лукашэнкі, ані ў гаспадарчым, ані палітычным плане. Ключы да гаспадарчай сітуацыі у Беларусі, аднак, у Маскве. Беларусь незвычайна моцна ўзалежнена ад расійскіх энергасыравін. Рынкам збыту для беларускіх прадпрыемстваў з'яўляецца перш за ўсё Расія. Таму Расія мае істотны ўплыў на ўнутраную сітуацыю Беларусі. Вядома, Расіі не залежыць на тым, каб звергнуць Лукашэнку. Мэтай Расіі з'яўляецца ўтрыманне пры ўладзе слабога Лукашэнкі, пакорлівага Крамлю. Іншыя расійска-беларускія варыянты — ілюзія. Масква накінула на Мінск гаспадарчую пятлю і памалу яе заціскае: памалу падымаючы цану нафты, памалу абмяжоўваючы доступ беларускіх тавараў на расійскі рынак і да г.п. Робяць гэта памалу, бо хочуць, каб сітуацыя кантралявалася імі. Моцны заціск спрычыніўся б да грамадскага выбуху. А яны не хочуць празаходняга варыянта: Юшчанкі ва Украіне ці Саакашвілі ў Грузіі. Бачаць, што найбольш прарасійскі палітык у Беларусі — Лукашэнка, і гэтага ім даволі. Хочуць толькі, каб быў ён слабы і больш пакорлівы перад імі.

— ***Калі зменіцца сітуацыя ў Беларусі?***

— Хоць няма сітуацый падобных, дык я параўнаў бы сітуацыю ў Беларусі з сітуацыяй у Польшчы ў 1987 годзе і тагачаснымі адчуваннямі польскага грамадства. У той год палякі яшчэ не ведалі, колькі працягнецца тая сітуацыя, у якой давялося ім жыць, ці будзе гэта дваццаць, ці пяць гадоў. Аказалася, камунізм праваліўся нечакана. Падобна сёння ў Беларусі. Вельмі папсавалася гаспадарчая сітуацыя. Цяпер, калі я выязджаў з Беларусі [18 сакавіка — М. Х.], былі праблемы з тым, каб купіць долары. Аказалася, што ёсць такі дэфіцыт валюты, што перад абменнымі канторамі стаяць чэргі. Радыкальна ўзрос дзяржаўны доўг. Незалежныя эканамісты мяркуюць, што гэта вельмі сур'ёзная праблема беларускіх улад. Аляксандр Лукашэнка не спраўляецца з гаспадаркай. Калі гэтая тэндэнцыя будзе трымацца, можна разлічваць на хуткае заламанне ўлады ў Беларусі. Лукашэнка, аднак, не з'яўляецца такім прастаком, якім яго лічаць. Ён спраўны палітык. За шаснаццаць гадоў кіравання заўсёды падаў на чатыры лапы. У цяперашні час, аднак, патрэбныя гаспадарчыя рэформы. А гэта паўплывае на рост настрояў незадаволенасці, пратэстаў. Апазіцыя зможа выкарыстаць гэтую сітуацыю. Аднак трэба памятаць, што Лукашэнка, як паказвае шаснаццацігадовы досвед, штосьці можа выдумаць. Цяпер трэба ўважліва назіраць за тым, што адбываецца ў Беларусі.

— ***Дзякуем за размову.***

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Пацешылі пенсіянераў...

1 сакавіка была праведзена пераацэнка пенсій. Пенсіянеры спадзяваліся, што капне ім некалькі злотых для падмацавання дамашняга бюджэту, бо зараз цэны растуць як грыбы пасля дажджу. Падаражалі хлеб, цукар, мясныя вырабы, паліва, лякарствы... У агульным падліку я вымушаны выдаць на прадукты каля сотні злотых больш у месяц, не гаворачы пра лякарствы. А прыбаўкі атрымаў я... 38 злотых. Вось, даражэнькія, да чаго мы дакаціліся.

Нядаўна ліквідавалі суперсучасную цукроўню ў Лапах і падобную ў Сакалове-Падляшскім. Яшчэ нядаўна горбы буракоў завальвалі чыгуначную станцыю ў Лявіцкіх. Сяляне мелі прыбытак з вырошчвання гэтага караняплода. Зараз прадпрыемствы пайшлі „пад малаток", а мы вымушаны плаціць больш пяці злотых за кілаграм цукру. Скандал!

Пры камуне царыў лозунг „Кожны колас на вагу золата". Сяляне засявалі кожны лапік зямлі, апрацоўвалі нават няўгоддзі. Працвітала жывёлагадоўля. Працавалі пункты скупкі жывёлы. Зараз сенажаці парастаюць пустазеллем. Травы ніхто не косіць, бо непрыдатная. Кароўку ці коніка неўзабаве будзем аглядаць адно ў заапарку. Палі абсаджваюць лесам, каб звярына разводзілася і „паны" маглі паляваннем заняцца. Вось якая сучасная рэчаіснасць!

Не плаціць багаты...

Пры канцы мінулага года задоўжанасць Чаромхаўскай гміны складала 3 986,157 зл. Банкавы крэдыт на суму 3 943 702 зл. узяў перад адыходам з пасады войт Міхал Врублеўскі. Грошы прызначаны былі на водаправод і каналізацыю. Пасля выбараў новы кіраўнік самаўрада тлумачыў, што мае абмежаваныя сродкі на планавыя інвестыцыі. Як мне паінфармавала скарбнік гміны, у палове сакавіка задоўжанасць паменшылася ўжо на 2 819 756 зл. Каб далей абмежаваць выдаткі, гміна рашыла эканоміць на вулічным асвятленні. Зараз яно ўключаецца а палове сёмай вечара і гарыць да 23 гадзіны, затым наступае перапынак да трэцяй раніцы, а выключаецца а палове пятай. Як сказала спадарыня скарбнік, гміна ў мінулым годзе выдала на гэтую мэту 121 072,84 зл. і 18 498,25 зл. на кансервацыю лініі. Хоць крэдыт быў узяты ў мінулым скліканні, то новы самаўрад вымушаны яго пагашаць. Народная мудрасць напамінае: «Не плаціць багаты, толькі вінаваты». Такое ўжо права натуры **(УС)**

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У Крынках у школе Лукаша Дзекуць-Малея

Згуртаванне „Тэрра Інкогніта" (Невядомая зямля) 23 сакавіка запрасіла на чарговую сустрэчу з цыкла „У добрай кампаніі", на якую прыбылі таксама і ўлады — бурмістр мястэчка і старшыня гарадской рады — на ўспамін пра Лукаша Дзекуць-Малея, які меў дачыненне і да Крынкаўскай зямлі. Сустрэча, якую вяла доктар Лена Глагоўская, праводзілася ў публічнай бібліятэцы — драўляным доміку непадалёк храма. Праўдападобна якраз у гэтым будынку была тая беларускаая школа, якую заснаваў Лукаш Дзекуць-Малей (1888-1955), пратэстанцкі святар, прасвітар, рэлігійны і культурна-грамадскі дзеяч, біблеіст, педагог, мецэнат і выдавец, перакладчык рэлігійнай літаратуры. Нарадзіўся ён 1 кастрычніка 1888 г. у Гродзенскай губерні. Паходзіў з пратэстанцкай сям'і Мікалая Дзекуця-Малея. Вучыўся на Першых беларускіх настаўніцкіх курсах у Вільні (1913). Працаваў настаўнікам. Служыў у расійскай арміі ў Беластоку, дзе пазнаёміўся з вернікамі царквы баптыстаў. З 1910 г. звязаны з пратэстанцкім рухам. Нейкі час жыў у Пецярбургу, дзе на працягу двух гадоў наведваў біблейскія курсы. У 1918 г. браў удзел у працы Беларускага сялянскага з'езда ў Гродне, на якім быў абраны ў Гродзенскую павятовую раду і Арганізацыйны камітэт па скліканні Краёвага беларускага з'езда Гродзеншчыны. 13 лютага 1919 г. быў арыштаваны польскімі вайсковымі ўладамі і пазней вызвалены. Адзін з арганізатараў „Грамады беларускай моладзі ў Горадні". Летам 1919 г. быў кіраўніком Гродзенскай цэнтральнай беларускай вучыцельскай рады. З 1920 г. — адзін з лідараў Беларускага нацыянальнага камітэта і старшыня Беларускай школьнай рады ў Гродне. У ліпені-верасні таго ж года быў на пасадзе камісара сацыяльнага забеспячэння Гродзенскага рэўкома. Да пачатку 1920-х гадоў вёў святарскую дзейнасць. Быў пратэстанцкім прапаведнікам у Берасці. У 1920-1924 гг. пераклаў з польскай і рускай моў на беларускую 17 рэлігійных брашур. Сумесна з Антонам Луцкевічам выдаў на беларускай мове „Новы Запавет і Псальмы" (Гельсінгфорс 1931). З праўдамі і паўпраўдамі пра Лукаша-Дзекуць Малея навукова змагаецца доктар Лена Глагоўская — якраз хто сапраўды быў перакладчыкам святых пісанняў на беларускую мову, ці сапраўды кнігі выдаваліся ў Хельсінкі, дзе пахаваны гэты пастар, чалавек верны словам Хрыста і айчыне.


Доктар Лена Глагоўская на фоне Лукаша Дзекуць-Малея

У міжваеннае дваццацігоддзе Лукаш Дзекуць-Малей шырока вёў нацыянальна-культурную, рэлігійную і дабрачынную дзейнасць у Заходняй Беларусі. У снежні 1927 г. адкрыў малітоўны дом, пры якім арганізаваў кравецкія і пчалярскія курсы. Пазней там жа адчыніў дзіцячы прытулак і нядзельную школу. З прыходам Чырвонай Арміі ў Беларусь праследавалі яго савецкія ўлады. Арыштаваны 19 чэрвеня 1941 г. органамі бяспекі. Знаходзіўся ў камеры для „смяротнікаў". У гады Другой сусветнай вайны жыў на бацькаўшчыне. Вёў святарскую дзейнасць, займаўся перакладамі. Выдаў у Мінску ў 1942 г. малітоўнік на беларускай мове. Напрыканцы вайны пакінуў Беларусь. З другой паловы 1940-х гадоў жыў у Гданьску. Служыў прасвітарам у баптысцкай царкве. Памёр 20 студзеня 1955 г. у Гданьску — гэтак коратка пішуць пра яго ў энцыклапедыях, бывае, што памылкова і недакладна. Даследчыца Лена Глагоўская, якая не толькі з навуковай адданасцю праходзіць часам непраходныя сцежкі, сходжаныя ратаямі на беларускай ніве, асабліва тымі нам найбліжэйшымі, з нашага староння, удакладняе і вясвятляе іх лёс нават пасля жыцця. Даводзіцца часам ёй праставаць меркаванні, распаўсюджаныя друкам асобамі, якія мо і чулі нешта, але далей працягваюць памылковыя меркаванні ці факты. Калі стаў баптыстам Лукаш Мікалаевіч? Служыў ён у расійскім войску ў Беластоку, дзе пазнаёміўся з вернікамі евангельска-баптысцкага веравызнання, стаў наведваць іх царкву. У ноч з 31 снежня 1911 г. на 1 студзеня 1912 г. на рацэ Супрасль прыняў хрышчэнне. Выкладаў вадохрышча прасвітар беластоцкае царквы Раман Хамяк. У 1912 г. (або пачатку 1913) пачаў прапаведаваць, за што быў арыштаваны ў Лыскаве (Пружанскі раён) і прывезены ў турму ў Беластоку. У 1913 г. стаў студэнтам першых біблейскіх курсаў евангельскіх хрысціян у Санкт-Пецярбургу. У 1915 пачаў вучыцца ў духоўнай семінарыі. Не так было, як у іншым беларускім часопісе, што „з'ехаўшы з Крынак (1919) стаў місіянерам-баптыстам". Пасля 1916 г. (ці 1917) заняўся душпастырскай працай у Гродне. У канцы 1918 г. прызначаны літоўскім урадам камісарам акругі Крынкі-Лунна. Прыязджаў у Гродна з Крынак 30 снежня 1918 г. і 16 студзеня 1919 г.

Беларуская асветніцкая дзейнасць Лукаша Дзекуць-Малея на Гродзеншчыне сутыкалася з вялікімі цяжкасцямі. У 1919-1920 гг. польскія ўлады зліквідавалі арганізаваныя там раней беларускія школы, замяняючы іх на польскія.

Лена Глагоўская распавяла, падмацоўваючы аповед здымкамі і дакументамі, пра іншых дзеячаў рэлігійнага і беларускага руху таго часу, між іншым, настаўнікаў родам з Крыншчыны і Сакольшчыны, між іншым, Насцю Кішкель з Крынак і Вольгу Якуту з Вароняга Лугу, а таксама пра жонку Лукаша Дзекуць-Малея Серафіну з Кішкаў, настаўніцу, перакладчыцу, рэлігійную дзяячку, верную спадарожніцу жыцця, працы і веры свайго мужа-пастыра. Пра знаёмства з пастарам Лукашом Дзекуцем-Малеем і яго прапаведніцкую дзейнасць на Беласточчыне расказала таксама Вера Валкавыцкая, якой бацькоў ён вянчаў, і ў якой засталіся памяткі — рэлігійныя выданні пастара на беларускай мове. Да яе збораў далучана будзе м.інш. магістарская праца яго ўнучкі Альжбеты Дзекуць-Малей пра лёс, дзейнасць, спадчыну і ролю ў грамадска-палітычным жыцці беларусаў і баптыстаў Лукаша Дзекуць-Малея.

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

Недастойныя апостальскай місіі?

— Я спадзяюся і веру ў тое, што беларуская мова зойме належнае ёй месца ў касцёлах і цэрквах, — кажа Крыстафор Гос, — што яна дастойная таго, каб на ёй маліцца і гаварыць з Богам.

Планаваная на 26 сакавіка г.г. імша ў інтэнцыі ідэалаў БНР у беластоцкім прыкафедральным касцёле не адбылася. Аднак людзі, якія прыйшлі на імшу, не разышліся. І як гэта прынята ў Рэспубліцы Беларусь, без святара самі памаліліся за ідэалы БНР.

Малітву павёў ініцыятар сустрэчы Крыстафор Гос. Перад гэтым ён паясніў, чаму лічыць маральным абавязкам змагацца за багаслужбы на беларускай мове.

— Аднойчы, калі я быў на беларускай правінцыі, людзі сказалі, што ім непатрэбная беларуская мова ў касцёле, бо на гэтай мове яны размаўляюць са свінямі. Гэта мяне настолькі ўразіла, што я рашыў нешта зрабіць. На маю ангажаванасць паўплывалі таксама несумленныя адносіны і ігнараванне людзей. Адна мая знаёмая, калі яе запрасіў на імшу, сказала: *Добра, што нечым займаешся, гэта безумоўна карысна для твайго здароўя*. Тут Крыстафор Гос дадаў, што з-за хваробы не быў прыняты ў духоўную семінарыю. Тая знаёмая адмовілася ад удзельніцтва ў беларускіх багаслужбах, бо, паводле яе, беларуская мова *яшчэ больш хамская, чым расейская!*

Пасля такіх цярновых, балючых слоў, наперакор ментальным абставінам, сабраныя памаліліся за годнае месца беларускай мовы ва ўсіх хрысціянскіх канфесіях. Чарговая інтэнцыя была прысвечана памяці стваральнікаў БНР і ўсіх дзеячаў, што заслужыліся на ніве беларускай мовы і культры. Вядучы прапанаваў памаліцца таксама за ўлады, каб яны заўсёды кіраваліся дабром чалавека. І за мірнае ды згоднае сужыццё братоў каталікоў і праваслаўных на Падляшшы.

На канец Крыстафор Гос шчыра падзякаваў жменьцы людзей, якія, нягледзячы на адсутнасць святара, засталіся ў касцёле.

— Гасподзь сказаў: „Калі ў Маё імя збіраецца двух або трох, Я разам з імі", — дадаў ініцыятар сустрэчы.

* * *

Пачаткова на беларускую імшу у інтэнцыі БНР збіралася шмат народу. Хоць яшчэ ў суботу СМІ інфармавалі пра імшу, людзі ўжо ведалі, што планаваная багаслужба, якую меў павесці айцец Алег Грыгатовіч, не адбудзецца. Адсутнасць ксяндза, які два дні да планаванай сустрэчы адмяніў свой прыезд у Беласток, была эмацыйна і шматбакова асветлена ўдзельнікамі ў кулуарах святкавання ўгодкаў БНР у Беластоку. Разгублены Крыстафор Гос не ведаў як даць сабе рады ў гэтай недарэчнай і непрыемнай сітуацыі. Па прычыне часавых абмежаванняў немагчыма было запрасіць іншага духоўнага. Адмяніць імшу таксама не было як, паколькі інфармацыя пайшла ў СМІ і па асабістых запрашэннях. На шчасце людзі не падвялі і планаваная малітва ў старажытных мурах касцёла прагучала:

— Я захоплена гэтай сустрэчай, — кажа ўдзельніца малітвы. Пра багаслужбу даведалася яна на сустрэчы Сяброў крэсаў у беластоцкай Галерэі Сляндзінскіх, — усе малітвы былі для мяне зразумелыя і такія... прыгожыя. Хоць мы размаўлялі на польскай мове, мая субяседніца дадала, што беларуская мова ёй не чужая, бо сама яна родам ад Саколкі.

Першая беларуская імша ў гонар БНР адбылася 25 сакавіка 2009 года ў тым жа прыкафедральным касцёле, таксама па ініцыятыве Крыстафора Госа.

Яднае нас беларускасць

93 год запар адзначаецца 25 Сакавіка — гадавіна абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Чым больш мінае гадоў ад яе ўзнікнення, тым штораз лепш становіцца зразумелым, што абазначае такі выклік, дадзены нашымі продкамі суседзям і ворагам беларускай справы. І калі глядзець на сённяшні дзень, то менавіта беларуская вера ў лепшыя хвіліны для беларускай дзяржавы і нацыі бярэцца менавіта з гэтых сакавіцкіх дзён. У гэтыя дні мы яшчэ больш выразна адчуваем еднасць з нашым беларускім вольным духам і сімваламі незалежнай Беларусі. Уладзімір Някляеў некалькі гадоў таму назад напісаў цудоўны верш пра бел-чырвона-белы сцяг, які прыгожа выконвае Зміцер Вайцюшкевіч. Менавіта пад гэтым сцягам мы свабодныя і салідарныя з усімі тымі дэмакратычнымі кандыдатамі на пасаду прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія зараз пераносяць здзек і пакуты з рук антыбеларускай улады. Мы салідарныя з усімі рэпрэсаванымі і іх сем'ямі, мы адчуваем духоўную сувязь з тымі, каму Беларусь гэта сапраўдная дзяржава па форме і змесце тытульнай нацыі. Сярод тых людзей мы маем шмат сяброў, якія часта бывалі на Беласточчыне і разумеюць як важнымі для захавання патэнцыялу беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы з'яўляюцца яе кантакты з жывой і нармальнай беларушчынай. І хаця зараз сотні людзей пазбаўленыя працы, зарплаты, прысуджаныя да турэмнага зняволення і прымушаныя да палітычнай эміграцыі, то мы верым, што вытрымаеце ўсё гэта і разам будзем цешыцца вашай перамогай. Верым, што чарговыя доказы беларускага дэмакратычнага шляху прынясуць свае плады. Трымайцеся! Дзякуем вам за тое, што з такой годнасцю бароніце справу, паднятую нашымі продкамі ў 1918 годзе.

Нам, беларусам у Польшчы, пры нагодзе святкаванняў Акту 25 Сакавіка заўсёды спадарожнічаюць пытанні пра нашую будучыню. Ужо першага красавіка ў Польшчы распачынаецца перапіс насельніцтва. Мы запішамся беларусамі — такі адказ на пытанне пра нацыянальнасць хацелася б пачуць на Беласточчыне: ад Дубровы, праз Саколку, Беласток, Гайнаўку, Бельск-Падляшскі, Сямятычы, па Белую-Падляшскую, у гмінных мястэчках і невялікіх вёсках. Беларусамі запішуцца і тыя, што раз'ехаліся па Польшчы, Еўропе, свеце. У гэтай справе давайма асабісты прыклад нашым блізкім, знаёмым, родным — такім чынам аддамо таксама пашану і тым беларусам Беласточчыны, якія сваёй працай, а часта жыццём ахвяравалі сябе і ў сакавіку 1918 года, і ў наступных дзесяцігоддзях так крывавых і неспрыяльных для беларускай справы.

Зараз цешыць тое, што ў гэтым годзе ў гміне Орля з'явяцца двухмоўныя польска-беларускія дарожныя ўказальнікі. Думаю, што падзяка для арлянскага самакіравання з'яўляецца нашым абавязкам і прыемнасцю. Маем таксама надзею, што іх працертым ужо следам пойдуць іншыя самакіраванні.

У гэтым годзе тыднёвік беларусаў Польшчы „Ніва" адзначае 55 гадоў быцця на добрае і благое са сваім народам. Мы разам з „Нівай" запісалі і надалей запісваем на яе старонках наш нялёгкі шлях. Хачу вельмі падзякаваць усім рэдактарам, журналістам, пісьменнікам, карэспандэнтам, чытачам за супольнае фармаванне фундаментаў трывалай беларускай прысутнасці ў Польшчы. Няхай чытальніцтва і падпіска беларускіх выданняў будзе звычайнай штодзённай справай усёй нашай грамадскасці, а не актам нейкай звышахвярнасці. Так робяць іншыя народы і нацыянальныя меншасці. Жыць і працаваць на беларускай ніве для наступных пакаленняў — гэта творчы выклік для многіх настаўнікаў беларускай мовы і іншых прадметаў, навукоўцаў, дырэктараў школ і дамоў культуры, сяброў няўрадавых арганізацый, кіраўнікоў і ўдзельнікаў мастацкіх і музычных калектываў. Яднае нас беларускасць. І ў гэты святочны дзень нацыянальнай адказнасці хочацца верыць, што заклік „Жыве Беларусь!", які заўсёды ўзносім, перадамо наступным пакаленням.

Яўген ВАПА

ВІНШУЕМ З ДНЁМ ВОЛІ!

Дасылаем наш зварот — заяву да сусветнага грамадства пра сітуацыю ў Беларусі пасля 19.10.2010 г.

Заява ад беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы

Пасля фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі 19 снежня 2010 года назіраюцца спробы легітымізаваць рэжым Лукашэнкі і апраўдаць рэпрэсіі, якія адбываюцца ў Беларусі. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца шэраг лаяльных да беларускай улады арганізацый. Як прыклад — вынікі канферэнцыі, якая адбылася 12 сакавіка ў Рызе, на якой быў прыняты зварот з пратэстам супраць санкцый да рэжыму Лукашэнкі.

У сувязі з гэтым заяўляем, што мы, беларускія грамадскія арганізацыі Літвы, якія не ўваходзяць у „Згуртаванне беларусаў Літвы" — не падтрымліваем прыняты на каферэнцыі ў Рызе зварот. На працягу доўгага часу назіраліся шматлікія спробы кіраўніцтва Еўрапейскага Звязу і сусветнай грамадскасці, дамагчыся дэмакратызацыі Беларусі, але большасць з іх была, на жаль, малаэфектыўнай, таму што дыктатура разумее толькі мову сілы. Гэта пацвярджаецца тым, што толькі тады, калі ўзнікала пагроза эканамічных санкцый, вызваляліся палітвязні і зніжалася хваля рэпрэсіяў.

Звяртаемся да Еўразвязу і сусветнай грамадскасці з заклікам зрабіць рашучыя крокі зараз, якія паспрыяюць спыненню рэпрэсіяў у Беларусі. Такімі крокамі павінны стаць усе неабходныя санкцыі, супраць рэжыму Лукашэнкі.

Разам з тым мы заўсёды гатовыя да дыялогу з усімі дэмакратычнымі сіламі, як унутры Літвы, так і за яе межамі і падтрымліваем дыялог Еўропы з Беларуссю, пры ўмовах спынення рэпрэсіяў, вызвалення палітвязняў і правядзення свабодных дэмакратычных выбараў.

ЗАЯВА Віленскага беларускага таварыства палітычных вязняў і ссыльных

У адказ на зробленую прэзідэнтам Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве сп. Р. Вайніцкім заяву для DELFI ад імя беларусаў краіны напярэдадні каферэнцыі беларусаў замежжа (Эстоніі, Латвіі, Літвы, Польшчы і Расіі) у Рызе ў сваю чаргу заяўляем, што:

Ні я асабіста, як фізічная асоба і як беларус, ні наша таварыства, як асоба юрыдычная і як адна з беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве, якую я маю гонар прадстаўляць, нікога, у тым ліку сп. Р. Вайніцкага, рабіць якія-небудзь заявы ад майго/нашага імя не ўпаўнаважвалі.

Думаю, што перш чым выступаць з падобнымі заявамі, трэба было пацікавіцца спачатку меркаваннем іншых беларусаў/беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве.

Да таго ж, грамадскія арганізацыі аб'ядноўваюць у сваіх шэрагах толькі вельмі нязначную частку нашага грамадства. Таму, рабіць такія заявы ад імя ўсіх беларусаў Літвы, як мінімум, не карэктна.

У сувязі з вышэйсказаным заяўляем, што Віленскае беларускае таварыства палітычных вязняў і ссыльных ніякага дачынення да гэтай заявы не мае і яе не падтрымлівае.

Старшыня Віленскага беларускага таварыства палітычных вязняў і ссыльных Валянцін Стэх

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Роднае слова — без сюрпрызаў!

На раёным дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова” ў Беластоку не было сюрпрызаў. У асноўным усе лаўрэаты паўтарылі свой мінулагодні поспех. Гран-пры заваяваў *Міхась Бабік*, вучань беластоцкай „чацвёркі”. Сярод лаўрэатаў першага месца апынулася таксама *Магдалена Бабік, Зося Конюх* з ПШ № 4, сёстры *Соня Ніна і Лена Сульжычанкі* з Гарадка, *Мая Засім* з Рыбалаў. Сярод новых лаўрэатаў была адна *Юлія Баровіч* (Прадшколле № 14 у Беластоку). Калі ідзе пра гімназістаў — камісія прызначыла першае месца ветэранцы конкурсу *Юліце Нікалаюк* з беластоцкай гімназіі № 7.

Зося Конюх

— Я выступаю ад заўсёды, — адзначае гімназістка, — але толькі цяпер мне *штось далі!*

Юлія дэкламавала верш Ларысы Геніюш *Родная мова*. Папраўдзе, не было ў яе вялікай канкурэнцыі. Чамусьці ў гімназіі зацікаўленне конкурсам рэзка падае.

Калі гаварыць пра іншыя выступленні, якія запамяталіся ў цэлай масе — усіх дэкламатараў было 129 — дык трэба назваць яшчэ прозвішча *Дар'і Астапчук* з Гарадка. І папракнуць дзяўчыну за недахоп падрыхтоўкі. У Дар'і, у адрозненні ад многіх выступоўцаў, якія кіраваліся аднымі амбіцыямі, ёсць сцэнічныя здольнасці.

У гэтым месцы варта таксама пахваліць *Кубу Андрацкага* з Саколкі за найлепшую беларушчыну. Тут таксама цікавая загвоздка: хлапец не вывучае беларускай мовы ў школе! Здаецца, пашкодзіла яму традыцыйная падборка прыродаапісальнага фрагмента прозы, якая, хоць прыгожая і старанна падрыхтаваная, стаміла манатоніяй.

З наймалодшых дэкламатараў запамяталіся яшчэ *Бэата Спас* і *Дарыюш Хамянюк* з Беластока.

Хоць большасць выступоўцаў не называла аўтараў сваіх твораў, як штогод пераважалі жартоўныя вершы класікаў беларускай дзіцячай літаратуры *пра коцікаў і зайчыкаў*. Гэтая абыякавасць да пошукаў і неахвота называць аўтараў не спрыяюць пашырэнню ведаў пра беларускую літаратуру. Наколькі гэта важная справа, хай сведчыць такі прыклад. Вельмі пазітыўна, калі ідзе пра падборку твораў, уразілі вучні з Залук. Вось яны часта дэкламавалі творы Андрэя Хадановіча. Некалькі разоў прозвішча маладой зоркі беларускай паэзіі было агучана са сцэны. Для многіх гэта было першае знаёмства з аўтарам. Гарадок у сваю чаргу павярнуў у бок лакальнага патрыятызму і выступаў з вершамі сваіх землякоў: Ягора Хлябіча і Анатоля Парэмбскага.

Лена Сульжык

Соня Сульжык

Вельмі дарэчы і адважна прагучаў таксама верш Уладзіміра Някляева — паэта, які зараз знаходзіцца ў хатнім арышце. З творам „Так пісаць” выступіла *Юстына Апольская* з ПШ № 4 у Беластоку. Арыгінальны падыход праявілі таксама вучні з Шудзялава. Яны падрыхтавалі вядомыя творы польскай дзіцячай літаратуры на беларускай мове.

Словы прызнання належаць таксама дэкламатарам з Рыбалаў, якія, нягледзячы на адсутнасць беларускай мовы ў школе, старанна рыхтуюцца да ўсіх беларускіх конкурсаў.

Варта падкрэсліць, што „Роднае слова” адзначае круглую гадавіну — яму 40 гадоў. У гэты раз галоўным арганізатарам было Таварыства беларускай культуры (дачка БГКТ). Раённыя спаборніцтвы ў беластоцкай акрузе адбыліся 21 сакавіка г.г. у памяшканні БГКТ па вуліцы Варшаўскай 11. Конкурснікаў ацэньвала журы ў саставе: д-р Базыль Сегень (старшыня), Тамара Русачык і Галена Добаш. Ад гадоў арганізатары „Роднага слова” ганарацца МАСАВАСЦЮ конкурсу. Паводле іх гэта РАЗВІЦЦЁ! Гэтага пажаданага для ўсіх прагрэсу, на жаль, не відаць на этапе гімназіі. Як вядома, не цяжка заахвоціць да выступленняў дзяцей з прадшколля. Асабліва ў наш медыйны час, калі кожны хоча выступіць у тэлебачанні. Але ці гэта суправаджаецца цікавасцю да паэтычнага слова і беларускай літаратуры? Яшчэ горш у нас з беларускай мовай. На пытанне:

Міхась Бабік

Магдалена Бабік

— *Чаму прымаеш удзел у „Родным слове”?* — чуўся адзін адказ.

— Występuję, aby zająć jakieś miejsce. Амаль ніхто з іх не памятаў аўтара свайго твора.

У гэтым месцы мне хацелася паставіць ім вялікую ХМАРКУ!

ЗОРКА,
фота Ганны КАНДРАЦЮК

Юліта Нікалаюк

Буслава лапка

(з народнага календара)

7 красавіка, *Благавешчанне — Дабравешчанне Прасвятой Дзевы.*

У народзе прынялося павер'е, што ў гэты дзень бусліха зносіць першае яйка. Свята заўсёды спалучалася з прылётам буслоў. Людзі назіралі за іх прылётам. Калі бусел прыляціць тыдзень да Благавешчання — лета будзе добрае, калі тыдзень пазней — трэба рыхтавацца на няўдачы ў гаспадарцы і ў полі. Каб прыпадабацца буслу і звязаць яго з гняздом у вёсцы, людзі выпякалі адмысловае пячэнне: буславыя лапкі (яго называлі таксама галёпкамі) і даравалі іх дзецям. Такім спосабам стараліся запэўніць працяг у родзе і ў гаспадарцы.

Буславыя лапкі і жаваранкі спечаныя беластоцкімі студэнткамі

Вельмі важным у магічным сэнсе лічылася 6 красавіка. У гэты дзень забаранялася снаваць кросны і ткаць. Людзі верылі, што вытканая ў гэты дзень тканіна накліча смяртэльную хваробу на чалавека, які апране заснаванае або сатканае ў гэты дзень адзенне.

ЗОРКА

Цікавасць — першая прыступка да поспеху!

— А што найбольш цікавае ў працы „Зоркі"? — спыталі мяне вучні з Гарадка.

Прыемна, калі вучні ставяць добрыя пытанні!

— *A czy pani jest z Białorusi?* — пачулася ў мой адрас.

Што ж... Такія пытанні паставілі мне нядаўна ў Чаромсе і ў Бельску. Калі чую такія словы, гавару ім: *Спытайце ў сваёй мамы і тата чаму яны запісалі вас на беларускую мову!*

У Гарадку адразу ведалі:

— Бо мой дзедка *беларус*, — адазваўся жулікаваты хлапец.

— А мой дзядзька спявае ў беларускім *зэсполе* (гурце), — дадала яго сяброўка.

Пасля мы наладзілі конкурс пра слаўных людзей Гарадка. І вось, сто гадоў таму жыў тут беларускі паэт М. А. Арол. Яго вершы часта дэкламуюць вучні старэйшых класаў на конкурсе *Роднае слова*.

Вучні IV класа з настаўніцай Тамарай Бялькевіч

Каб асоба паэта лягчэй запамяталася, мы паяснілі што насамрэч паэт называўся Сцяпан Пятэльскі. М. А. Арол — гэта яго літаратурны псеўданім.

Знаёмству з мясцовымі аўтарамі дапамагае дэкламатарскі конкурс. Сёлета вучні падрыхтавалі вершы Ягора Хлябіча і Анатоля Парэмбскага. Першы аўтар нарадзіўся ў Валілах, другі жыве ў Гарадку. Калі чытаем іх вершы, хочацца і самому сказаць слова пра мястэчка, пра прыроду, сяброў. І вось, мы пазнаёміліся з Дар'яй Сержан з пятага класа. Дар'я хоча быць рысавальніцай. І, як аказалася, піша ўжо кніжку для маладога чытача. Пра што? Пра змаганне добрых і злых сіл у космасе. На сустрэчу з „Зоркай" Дар'я напісала сонечны верш „Вясна".

— У школе маем таксама лаўрэатку прадметнага конкурсу, — адзначае настаўніца Тамара Бялькевіч.

Мова пра вучаніцу пятага класа. Яе поспехам ганарыцца цэлая школа. Кася Грыка адзіная на ўсю школу лаўрэатка прадметнага конкурсу ды другая ў гісторыі школы лаўрэатка беларускай алімпіяды.

ЗОРКА
Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Музыка з кайфам

Мора салідарнасці

„Ад мора да мора" — пра такую Польшчу мараць яшчэ і сёння некаторыя дзеячы і жыхары. Тым часам, зусім нечакана, ужо аднаго з марскіх берагоў, берагу Балтыйскага мора, кранае акцыя салідарнасці з Беларуссю. Гэта пункт гонару маладых актывістаў акцыі „Вольная Беларусь" і дзесяткаў валанцёраў у цэлай краіне, якія каля 25-га сакавіка на ўвесь свет гавораць „Пачуйце нас!". Пакуль гэтыя падзеі пашырацца і да Чорнага мора, памалу праводзяцца ў чарговых гарадах. Ужо не толькі Варшава, дзе кожны год праходзіць вялікі супольны канцэрт польскіх і беларускіх зорак, ці Беласток, які самы блізкі да беларускай мяжы. На карце культурных падзей паяўляюцца Кракаў, Люблін, Гданьск. Там беларускія арганізацыі ці такія, якія спрыяюць папулярызацыі ведаў пра Беларусь, маюць свае традыцыі. Але бачым таксама Влацлавак, Кельцы, Катавіцы, Лодзь. Хочацца спытаць: каго там можа цікавіць Беларусь? Можа і нешматлікіх, але пра беларускую культуру блізкія суседзі ведаюць мала, таму варта спрыяць тым, якім гэтая акцыя па сэрцы. Пра свабоду ці дэмакратычныя працэсы ўголас гавораць перш за ўсё музыкі, бо канцэрты прыцягваюць найбольш публікі, нясуць найбольш энергіі, падымаюць людзей. У час сёлетняй акцыі „падымалі" між іншым такія зоркі, як Зміцер Вайцюшкевіч ці „Крама". Можна сказаць — зоркі вялікага маштабу. Побач іх узялі голас таксама „Рэха", „Бан Жвірба" ці Vinsent. На розных сцэнах Польшчы розныя беларускія жанры, розныя камунікаты ды розная публіка, да якой накіраваная цэлая акцыя салідарнасці з беларусамі.

Разліваецца акцыя салідарнасці па Польшчы ўжо не нясмела, а адважна і хутка. А калі ўспомніць, што на карце паяўляюцца таксама такія гарады, як Лондан ці Вільня, то прыходзіць на думку вялікі аркестр святочнай дапамогі Юры Оўсяка. Ці акцыя ў падтрымку беларускай незалежнасці стане калісьці такой маштабнай? Вырашыць, мабыць, энергія людзей, а можа і сам непрадказальны кіраўнік беларускай дзяржавы...

i_basovka@o2.pl

Вясна

Я люблю вясну
за яе красу.
Яна такая зялёная і цёплая,
Люблю, што яна такая радасная.
Я не люблю зімы
за яе маразы.
Хай адыходзіць ад нас
І зноў прыходзіць у свой час.

Вясна, вясна жаданая,
Тут у Гарадку доўгачаканая.
Прыходзь да нас хутчэй.
Нам будзе вясялей.

Дар'я Сержан
кл. V „б", ПШ у Гарадку

Галерэя ЗОРКІ

Фота: Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Дар'я Сержан (V клас ПШ у Гарадку).
2. Мой любімы прадмет: фізкультура.
3. У жыцці хачу стаць: рысавальніцай.
4. У сяброў цаню: шчырасць.
5. Не люблю: падымацца раніцай.
6. Па-беларуску размаўляю: з бабуляй і на ўроках беларускай мовы.
7. Кніжка якая мяне захапіла: „Гары Потэр і Ордэн Фенікса".
8. Падабаецца мне музыка: рок і поп.
9. Мае ўлюбёныя стравы: садавіна.
10. Мой любімы спосаб адпачынку: люблю рысаваць і чытаць кніжкі.
11. Калі дарасту хачу жыць: у Гарадку.

Польска-беларуская крыжаванка № 14

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 10:

Ваяка, пяро, ар, кайф, рэ, сайт, ла, астра, траўка, вакзал, бал, абед. Лякарства, рай, трал, войт, рак, паўза, каб, карал, але, арэна.

Узнагароды, фламастэры, выйгралі **Юстына Якубюк, Віялета Дработка, Патрык Сасна, Наталля Тамчук, Мартына Швед, Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага, **Рафал Вакулюк, Оля Галёнка** з Арэшкава. Віншуем!



ВЕРШЫ

Тадэвуш КУНЦЭВІЧ

Суседкі

— Чэсць, суседка! Як па свяце?
Ці спакойна было ў хаце?
Чуць, што голасна спявалі,
мусі, госці прыязджалі?
— Ой, кахана, дарагая,
мусіць, то судзьба такая,
цэлы дзень ано трывога!
Ужо малілася да Бога.
Мой ужо з самога рана
голы лазіў, абязяна.
Што ён еў? Чаго напіўся?
Па трох чарках ужо зваліўся.
Не ўбраўся, не пабрыўся,
рана ўстаўшы пахмяліўся...
Ужо не Бог, а чорт сам знае,
што ён у галаве той мае.
— Ой, суседка, ніц такога!
Не малісь ужо да Бога!
Як напіўся — сверазее.
Горш, калі ўжо хто здурэе!
Мела я свайго за труса,
бачу, уключыў парнуса,
і так шчыра яго сочыць,
аж на верх вылазяць вочы!
Што яны там вычаўпаюць!
Усе голыя лягаюць,
раз з адною, раз з другою,
то рукою, то нагою!..
То не людзі! Малпішонкі!
Усе на купе — мужы, жонкі...
Як не крыкнуць, як не енкнуць!
Тэлевізар гатоў пэнкнуць!
Крычу: „Дурню ты пракляты!
Я ўзяла яго на раты!"
Ну, і што яму зрабіла?
Тэлевізара пабіла!

Пра суседзяў

Адкажы мой, даражэнькі,
чом такі ты неўдаленькі?..
Наш сусед ніц не трымае,
а заўсёды грошы мае.
Кроме грошаў мы ўсё маем,
садзім, сеем і збіраем,
свінка, гуска і кароўка,
а ў адным мне — астаноўка.
Ім — як з неба ўсё спадае,
яна — норкі нават мае,
ён амаль не як экспрэсам
новым ездзіць мерседэсам.
На разрыўку пазваляюць,
урляпуюць, п'юць, гуляюць.
Мы — не маем чаго крыці,
як падатак заплаціці.
Жыццё наша ёсць каротка.
Ходзь, зайграем у таталётка?
Мы не курым і не п'ем,
о, тады то пажывем!
Хату і сваю скаціну —
усё прайгралі ў хвіліну.
Не курылі, не пілі,
усе грошы развялі.
Калі ходзіць аб суседзяў,
нажыліся самых бедаў.
Пракурор ужо ўзнаў,
што сусед усёй час краў.
Чытачы хай адгадаюць,
як суседзі пражываюць.
Адзін гнездзіцца ў гумне,
а другі сядзіць у турме.

Новае выданне

Вяртанне спадчыны археолага Сяргея Дубінскага

Сяргей ЧЫГРЫН

Даўно я не трымаў у руках такога вялікага і шыкоўнага выдання, як кніга спадчыны „Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін" беларускага археолага Сяргея Дубінскага (1884-1937). Памер кнігі — 30 х 21см з 340 старонкамі. Яе выдала ў Беластоку Беларускае гістарычнае таварыства. Фінансавую дапамогу выданню аказалі Маршалкоўская ўправа Падляшскага ваяводства і Прэзідэнт горада Беластока. Гэта па-першае. Па-другое, над выданнем кнігі дбайна парупіліся гродзенскія гісторыкі Генадзь і Альбіна Семянчукі. Наогул, у апошнія дзесяць гадоў у Беларусі з'явілася вельмі моцная, працаздольная і цікавая школа гродзенскіх гісторыкаў, якія шмат карыснага робяць для беларускай гістарыяграфіі. Гэта, найперш Генадзь і Альбіна Семянчукі, Алесь Смалянчук, Ігар Трусаў, Алесь Краўцэвіч, Сяргей Токць, Святлана Куль-Сяльверстава, Святлана Марозава, Андрэй Вашкевіч, Андрэй Пачобут, Іна Соркіна, Андрэй Чарнякевіч і іншыя. Няхай мяне прабачаць тыя, каго тут не згадаў. Гэтыя хлопцы і дзяўчаты працуюць даволі плённа і шмат. І падобнай сябрынай гісторыкаў на сённяшні дзень не можа пахваліцца ні адзін абласны горад Беларусі. На жаль. Часцей у апошні час у беларускіх, асабліва мінскіх даследчыкаў, гісторыя нашай Бацькаўшчыны чамусьці пачынаецца толькі з нейкай „лініі Сталіна". Але далёка не з Міндоўга, Вітаўта, Альгерда, Скарыны, Гусоўскага, Купалы, Коласа, Геніюш, Быкава, Караткевіча...

І па-трэцяе. Вяртанне спадчыны Сяргея Дубінскага яшчэ раз падкрэслівае, што беларуская культура, літаратура і гісторыя — адны з багацейшых у свеце. Нам заўсёды было чым і кім ганарыцца. Іншая справа, што на працягу ўсяго, напрыклад XX стагоддзя, беларусам не давалі „людзьмі звацца", а быць толькі тутэйшымі. Тым не менш, гэтыя тутэйшыя стваралі сваю мову, літаратуру, даследавалі гісторыю, геаграфію, архітэктуру, археалогію. На ніве археалогіі плённа працаваў у 1920-1930-х гадах беларускі археолаг, гісторык і бібліёграф з Беласточчыны Сяргей Дубінскі. Ён нарадзіўся 13 кастрычніка 1884 года ў вёсцы Наройкі Сямятыцкага павета. Пасля заканчэння Пецярбургскага ўніверсітэта ў 1914 годзе пэўны час настаўнічаў. У 1925 годзе Сяргей Дубінскі становіцца сябрам гісторыка-археалагічнай камісіі Акадэміі Навук БССР, а пасля — навуковым супрацоўнікам Інбелкульта, а з 1931 года — у Інстытуце гісторыі Акадэміі Навук БССР. Адпрацаваўшы два гады ў Інстытуце гісторыі, нашаму земляку сказалі тэрмінова пакінуць тэрыторыю Беларусі і выехаць на пастаяннае месца жыхарства ў Ленінград. У 1933 годзе Сяргей Дубінскі назаўсёды пакінуў Беларусь і прыехаў у горад на Няве, дзе ўладкаваўся на працу ў Ленінградскую акадэмію гісторыі матэрыяльнай культуры.

За той час, калі наш зямляк жыў і працаваў у Беларусі, яму ўдалося зрабіць шмат чаго карыснага для беларускай археалогіі. Ён актыўна даследаваў помнікі ранняга жалезнага веку і эпохі сярэднявечча. Праводзіў разам са сваімі калегамі раскопкі і вывучаў курганныя старажытнасці ў Бельскім павеце, пасля гарадзішчы Бабруйшчыны, Міншчыны, Мазыршчыны, Магілёўшчыны і Віцебшчыны. Па словах даследчыцы беларускай археалогіі Таццяны Каробушкінай, у 1927 годзе Сяргей Дубінскі склаў археалагічную карту Магілёўскай вобласці, якая на жаль не захавалася.

Самай грунтоўнай і вялікай працай, якую пакінуў нам беларускі археолаг, з'яўляецца яго „Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін", асобнай кнігаю якая пабачыла свет у Мінску ў 1933 годзе. У ёй наш зямляк назваў працы пра дакласавае грамадства, ранні феадалізм, нумізматыку, сфрагістыку, старажытную архітэктуру, абарончыя збудаванні. У 20-30-я гады Сяргей Дубінскі паспеў напісаць і апублікаваць дзесяткі артыкулаў, сярод іх — „Доследы культур жалезнага перыяду па Віцебшчыне, Магілёўшчыне і Міншчыне", „Чаркасоўскае гарадзішча пад Оршай", „Раскопкі Банцараўскага гарадзішча каля Менску ў 1926 годзе", „Археалагічныя працы на Беларусі за 1919-1928 гады", „Гарадзішча каля вёскі Германаў Аршанскай акругі", „Доследы культур жалезнага перыяду на БССР у 1929 годзе" і іншыя.

На вялікі жаль, свае планы і задумкі наш таленавіты зямляк ажыццявіць не змог. Яго расстралялі ва ўзросце 53 гадоў у 1937 годзе. У 1958 годзе ён быў пасмяротна рэабілітаваны.

Пасля таго, як Сяргей Дубінскі быў рэпрэсаваны і расстраляны НКУС, фактычна рэпрэсаванай была і яго археалагічная спадчына. Унікальная „Бібліяграфія па археалогіі Беларусі і сумежных краін" археолага, як піша Генадзь Семянчук у пасляслоўі да кнігі, надоўга была выдалена з актыўнага навуковага звароту. Яе апісання нават няма на старонках энцыклапедыі „Археалогія і нумізматыка Беларусі" (Мінск 1993), а таксама энцыклапедыі „Археалогія Беларусі" (Мінск 2009). У навуковых бібліятэках Беларусі і ў прыватных кнігазборах „Бібліяграфія..." Сяргея Дубінскага захоўваецца ў некалькіх экземплярах. Таму выданне ў Беластоку спадчыны расстралянага беларускага археолага — гэта даволі значная падзея ў нашай археалогіі і гісторыі.

У беластоцкае выданне „Бібліяграфіі па археалогіі Беларусі і сумежных краін" Сяргея Дубінскага ўвайшлі не толькі сама бібліяграфія, але і асобныя артыкулы і даследаванні археолага, напісаныя ў 1920-1930-х гадах. Гэта тыя артыкулы, якія ўдалося адшукаць Генадзю і Альбіне Семянчукам. Яны прысвечаны археалагічнай працы на Беларусі за 1919-1929 гады, раскопкам курганоў у Бельскім павеце летам 1911 года, а таксама ў Заслаўі, гарадзішчам на Аршаншчыне, каля Мінска ў 1926 годзе, доследы культур жалезнага перыяду па Віцебшчыне, Магілёўшчыне і Міншчыне і іншыя. Але самай унікальнай працай усё ж застаецца „Бібліяграфія..." Сяргея Дубінскага. Дзіву даюся, дзе знаходзіў даследчык час, каб столькі перакапаць, адшукаць, занатаваць, каб пакінуць нашчадкам такі вялікі даследчы скарб. Як піша аўтар кнігі, за першыя трыццаць гадоў XX стагоддзя на Беларусі былі арганізаваны 27 археалагічных экспедыцый і 30 паасобных камандзіровак для археалагічных раскопак. У выніку гэтых прац упершыню былі знойдзены палеалітычныя стаянкі, да 700 стаянак эпохі неаліту і бронзы, да 800 гарадзішч, да 3 тысяч курганных груп, у якіх налічвалася звыш 25 тысяч курганоў і шмат іншых археалагічных помнікаў.

Цацэлі. Курган 26 (па плану) з паўднёвага боку. Крайні справа С. Дубінскі, 1911 г. (Архіў ІГМК РАН № 1911/89)

У выданне Сяргея Дубінскага складальнікі ўключылі фотаздымкі і малюнкі. На фотаздымках адлюстраваны раскопкі курганоў каля вёсак Цацэлі, Бацікі-Далёкія, Козлікі, Ляхі, Слохі і Клюкава Бельскага павета ў 1911 годзе. А таксама раскопкі каля Драгічына. Ёсць здымак і збіральніка драгічынскіх старажытнасцей Фелікса Каханскага.

Сяргей Дубінскі вельмі добра маляваў. Малюнкі аўтара, якія складальнікі ўключылі ў кнігу, звязаныя з археалагічнымі знаходкамі. Усё разам — і фотаздымкі, і малюнкі, і тэкст — дапаўняюць выданне, робяць яго насамрэч грунтоўным і навуковым.

Выданне спадчыны беларускага археолага Сяргея Дубінскага Беларускім гістарычным таварыствам, як і самыя помнікі археалогіі Беларусі — гэта каштоўная крыніца аб жыцці нашых далёкіх продкаў, нашай гісторыі, якую, калі дасканала і не ведаць, дык трэба хоць заўсёды зберагаць. І памятаць пра тых людзей, якія дбайна працавалі на ніве адраджэння беларускай археалогіі.

Віялета НІКІЦЮК-ПЭРКОЎСКАЯ

Старонка пра Юстыну Каролька

Паэзія — гэта жанр літаратуры для адважных. Адчувальнасць на словы звязана з магчымасцю стварэння напружанасці, пераказу чытачу разнастайных эмоцый, а гэта хіба якасці, дадзеныя толькі выбраным. Адной з такіх „выбраных" з'яўляецца паэтка Юстына Каролька (Грыцюк) — аўтарка паэтычнага зборніка з, на маю думку, вельмі таямнічай назвай — „Кроплі літар"*, першай кнігі, аднаго з наймаладзейшых сяброў „Белавежы". Пэўна ж, трэба прыгадаць, што Юстына закончыла Гайнаўскі беларускі ліцэй і беларускую філалогію Універсітэта ў Беластоку. Натуральна, яе кніга пабачыла свет у бібліятэцы Беларускага літаратурнага аб'яднання пад рэдакцыяй Яна Чыквіна.

Што ж у паэтычным кантэксце абазначае гэтае словазлучэнне: „кроплі літар"? Паводле тлумачальнага слоўніка беларускай мовы: *кропля = капля, назоўнік, жаночы род, маленькая круглая часцінка якой-небудзь вадкасці*, а як прыклады дадзена: *капля вады, капля дажджу*. А што з нашымі „кроплямі літар"? Можна інтэрпрэтаваць гэта так: кропля дажджу ў нас з'яўляецца метафарай літары. Кроплі твораць паток, літара — слова; паток — раку; слова — сказы. Рака можа ўлівацца ў мора або і акіян, а слова ў сваім руху можа стацца вершам, апавяданнем, або і раманам. Значыць, „кроплі літар" Юстыны Каролька — гэта ні што іншае, як яе глыбокія думкі, выказаныя на пачатку яе паэтычнага самавыяўлення ў форме кароткіх вершаў — кропель. Варта таксама згадаць, што словам „кроплі" аўтарка карыстаецца не аднойчы. У яе вершах выступаюць і „кроплі дажджу", і „кроплі свету"... Невыпадковай мне бачыцца і сама зялёна-марская вокладка зборніка: зелень абазначае надзею на творчае развіццё Юстыны Каролька — „з кроплі ў мора". Калі канкрэтызавацца, дык гэта карціна беларускага мастака Міколы Бушчыка „Лёгкае воблака" ўпрыгожыла першую кнігу паэткі.

Зборнік маладой „белавежанкі" не аб'ёмісты, але вельмі дапрацаваны. На 41 старонцы змешчана 24 вершы, далікатных і поўных розных пачуццяў, эмоцый, прадчуванняў... Праглядае праз іх прыгожая душа аўтаркі. Паэтка гаворыць нібы ціха, але яе шэпт, поўны вялікага зместу, дасягае глыбінь душы чытача.

Першае, што прываблівае вока ў кнізе — графіка. Пачаткова „абразкі" не выклікаюць ніякіх думак — ну, простыя „квадрацікі". Прыгледзеўшыся, аднак, да іх бліжэй, чытач можа раскрыць іх вялікі сэнс. Не будуць гэта ўжо простыя фігуры — толькі вялікія гісторыі. Кожны элемент, здаецца, хоча штосьці „сказаць". У нейкі момант звычайнае кола можа ператварыцца ў сонца, прастакутнік у хату, сукупнасць трохкутнікаў у зорку, пабачыцца і неба, крывая лінія будзе дарогай. Усё гэта ўзбагачае кнігу, а чытачу яна становіцца больш цікавай. Можа, дзякуючы графіцы прыцягне яна і асоб, якія не любяць чытаць вершаў — часам варта толькі паглядзець. Графіка ў кнізе належыць беларускаму мастаку з Мінска Уладзіміру Правідохіну.

Зборнік пачынаецца з метафарычнага верша пра каханне дзвюх нот, дзвюх чорных кропель свету, злучаных у адну цэласнасць:

абнімаюцца ў радку дарог
і цалуюць
адна нота другую ноту (с. 5)

Гэтыя кроплі, нібыта людзі, звязваюцца з сабою на цэлае жыццё. Ноты твораць песні, а людзі — сваё супольнае жыццё. Такое важнае для кожнага чалавека пачуццё, якім з'яўляецца каханне, Юстына раскрывае цудоўным і тым самым простым спосабам — праз персаніфікацыю нот. Яны ў паэтцы кахаюцца, жывуць адным цэлым.

Вядомыя паэтцы і адзінота, самота, смутак. Няма ў гэтым нічога дзіўнага. Адзінота з'яўляецца складнікам чалавечай душы, яе часткай. Кожны чалавек мае схільнасць да самоты — заўсёды будзе чагосьці або кагосьці не хапаць. Пра тое, што вас мучыць менавіта пачуццё самоты, скажа набор пэўных эмоцый, злучаных у асаблівы хваравіты стан. Гэта кактэйль з трывогі, змен настрою, часам бяссонніцы, беспрычыннага смутку, з адчування бязвыхаднасці, якое параджае няўпэўненасць у сабе. Аўтарка выяўляе дакладныя вобразы самоты — даўжыня часу, пустэча ў горадзе, адзінокая ружа ў флаконе, акно на могілкі. *Усё жывое / цяпер спіць* (с. 7), гаворыць яна ў адным з вершаў.

Аўтарка карыстаецца словам „спіць" невыпадкова, таму што, калі спіць — значыць прачнецца. Юстына верыць, што стан адзіноты закончыцца — верыць у лепшае заўтра. Яна думае пра тое, *што прынясе дзень зялёны* (с. 8). Вялізнай сілай, дзякуючы якой адчувае яна спакой душы, ёсць перакананасць у існаванні Анёла-Вартаўніка. Ведае, што хтосьці яе сцеражэ.

Як вартаўнік на варце
Стаіць, не маргае вокам (с. 8).

Сэнс жыцця лірычная гераіня вершаў Юстыны Каролька бачыць у самім навакольным свеце. Ліст, прамень, птушка, усмешка — узбагачаюць яе жыццё:

Усе яны
Непрыкметныя адзінокія
Даюць мне смак жыцця (с. 6)

Добра яна ведае і тое, што, акрамя дабра і шчасця, часта трыумфуюць зло і боль. Стоячы ў кроплях дажджу, яна думае пра змену чалавека на лепшае — *калі абудзіцца чалавек у чалавеку* (с. 10). І сама аўтарка хоча змяніцца:

І стацца хоць на хвіліну
Той, якой быць хачу (с. 23)

Шчасцем адарыла паэтку прыватнае жыццё: яна стала мамай. І ўзнік верш, прысвечаны дачушцы:

Ты — наш дыямант кахання
жыццё
прыдасць табе форму
адшліфуе
выгладзіць
пакуль не знойдзеш
сваю шурпатую палавінку
з залатым пярсцёнкам (с. 39)

Аўтарка ўжо амаль адразу пасля нараджэння дзіцяці думае пра яго будучыню. Ведае, што жыццю навучыць дачку ні што іншае, як само жыццё. Будуць на яе дарозе не толькі шчаслівыя, але і цяжкія моманты. У змаганні з перашкодамі знойдзе яна шчасце — сваё каханне.

Тэма шчасця адна з вядучых у „Кроплях літар". Кожны ў сваім жыцці хоча, каб шчасце яго ніколі не пакідала, але аўтарка слушна адзначае:

Зоркі мігцяць на небе
Адным — доўга
Іншым — зусім не свецяць (с. 17)

Сціпласць аўтаркі заўважыць кожны чытач. Маладая яшчэ Юстына не адчувае сябе паэткай пра што і сведчыць адзін з яе вершаў:

Паэты нясуць народы ў руках
А я нясу сумку пачуццяў (с. 15)

Думаю, аднак, што паэтка павінна павольна прывыкаць да гэтага свайго статуса і помніць, што яе брама ў паэтычны свет ужо адчынена.

Варта таксама адзначыць, што зборнік „Кроплі літар" Юстыны Каролька пабачыў свет дзякуючы сродкам Культурнага цэнтра Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

***Юстына Каролька, *Кроплі літар*, Беласток 2010, с. 41.**

«Алімпійскія» ўспаміны

Здаўна я цікаўлюся гісторыяй Беларусі, таксама вельмі люблю творчасць Уладзіміра Караткевіча. Я прачытала многа яго кніжак — выдатнае «Дзікае паляванне караля Стаха», «Каласы пад сярпом тваім» ці «Чорны замак Альшанскі». Не скрываю, што так блізкая мне тэма сёлетняй XVII Алімпіяды па беларускай мове «Беларуская гісторыя ў творчасці Уладзіміра Караткевіча» заахвоціла мяне да ўдзельніцтва ў ёй. Я таксама хацела праверыць свае агульныя веды, пабачыць як зарэкамендую сябе на фоне іншых удзельнікаў.

У час падрыхтоўкі з вялікай прыемнасцю я прачытала менш вядомыя творы — «Паром на бурнай рацэ», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», драмы «Маці Урагану» і «Кастусь Каліноўскі». Аднак найбольшае ўражанне на мяне зрабіла аповесць «Сівая легенда» — я проста не магла ад яе адарвацца. Маім любімым пісьменнікам з'яўляецца Генрык Сянкевіч і, чытаючы гэты твор, мне здавалася, што я чытаю Сянкевіча па-беларуску.

Некалькі дзён да цэнтральнай алімпіяды настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі запрапанаваў мне ўдзел у Рэспубліканскай алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры ў Дзяржынску, якая мела адбыцца ў днях 14-18 сакавіка. Як было адмовіцца? Я згадзілася з вялікай радасцю.

Разам са мной паехалі дзве вучаніцы нашага ліцэя — Юстына Авярчук і Віялета Башун. У Дзяржынску захапіла нас вельмі цёплае, сардэчнае прывітанне — арганізатары прынялі нас хлебам і соллю. Пасля смачнага пачастунку быў час на знаёмствы з іншымі ўдзельнікамі алімпіяды. Вечарам адбыўся канцэрт гуртоў і танцавальных калектываў з цэлай Беларусі. Мы пачулі Анастасію Віннікаву, якая будзе прадстаўляць Беларусь на „Еўрабачанні-2011".

Злева: Юстына Авярчук, Віялэта Башун, спадар Ян Карчэўскі, Марта Бялеўская

Рэспубліканская алімпіяда складалася з трох частак. Першага дня мы пісалі водгук на фрагмент апавядання «Буланы» Кузьмы Чорнага. У Беларусі гэтая форма тым розніцца ад нашай, што вучні пішуць выказванне толькі паводле фрагмента твора, без ніякай тэмы, указання. Наступнага дня нам прыйшлося змагацца з комплекснай работай — камісія правярала нашыя веды па беларускай граматыцы, літаратуры і гісторыі. Тэст быў вельмі складаны і нам паказаўся самым цяжкім. На трэці дзень мы прыступілі да вуснай часткі, якой мы, шчыра прызнаюся, найбольш баяліся. На білетах былі дзве тэмы да выбару — адна бытавая, другая па літаратуры. А вось з гэтай часткі мы атрымалі вельмі высокія вынікі, на раўні з удзельнікамі з Беларусі. А мой адказ камісія ацаніла як адзіны сярод усіх 107-мі вучняў, на максімум — 20 балаў.

У рамках алімпіяды арганізатары падрыхтавалі нам багатую, вельмі цікавую праграму. Мы былі ў Гарадскім доме культуры, куды на гастролі прыехалі акцёры Тэатра ім. Я. Купалы з Мінска з п'есай «Хто смяецца апошнім» паводле камедыі Кандрата Крапівы. Кожная з нас звярнула ўвагу на майстэрства выканаўцаў, на тое, як цудоўна яны ўмелі ўвайсці ў свае ролі. Мы таксама наведалі радзіму Якуба Коласа — Мікалаеўшчыну — дом, у якім ён прыйшоў на свет, былі ў музеі паэта ў Смольні. Мы не маглі адарваць вачэй ад багатых экспанатаў — арыгінальных здымкаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія так часта прыходзілася раней бачыць у падручніках.

Вялікім мерапрыемствам было заканчэнне і падсумаванне алімпіяды. Усе ўдзельнікі атрымалі дыпломы, а пераможцы — цікавыя ўзнагароды. І мне ўдалося заваяваць фінансавы прыз, якім я вельмі цешуся.

Уражанне на нас зрабілі таксама ўдзельнікі алімпіяды з Беларусі. Цікава было пазнаёміцца з сімпатычнымі, вясёлымі людзьмі, пасядзець за гарбатай, даведацца пра іх школьнае жыццё, падзяліцца сваімі ўражаннямі. Нашымі сяброўкамі сталі вучаніцы з Ліды. Мы абмяняліся з імі адрасамі і абяцалі пісаць да сябе праз Facebook ці VKontakte. Пабачым, што з гэтага атрымаецца.

Пяць дзён невядома калі праляцелі і трэба было ў панядзелак вярнуцца ў школу. А там на старонках «Нівы» я прачытала артыкул на тэму нашай XVII Алімпіяды па беларускай мове. Прызнаюся, што вельмі прыкра было даведацца, што я з'яўляюся вучаніцай Бельскага белліцэя, і прачытаць прыпісаныя мне словы, якія не зусім былі маімі, а маё выказванне — як словы сяброўкі.

Разам з сяброўкамі вельмі дзякуем нашаму настаўніку, спадару Янку Карчэўскаму за падрыхтоўку да алімпіяды і за клапатлівую, проста бацькоўскую апеку, дзякуючы якой, мы, быўшы ўсё-такі за мяжой, адчувалі сябе як дома. Дзякуем таксама дырэктару Культурнага цэнтра Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча спадару Аляксандру Карачуну, які аформіў нам усе неабходныя дакументы, звязаныя з выездам, завёз нас туды і назад на машыне.

Марта БЯЛЕЎСКАЯ

Васіль САКОЎСКІ

Мы і нашы суседзі (2)

Наступнай нашай суседкай з'яўляецца Украіна. Яна — таксама суседка і Беларусі. Беларусь і Украіну можна назваць проста сёстрамі. Беларусы і ўкраінцы вельмі блізкія сабе народы. У іх вельмі блізкія мовы і культуры, у іх адна рэлігія, яны ніколі не ваявалі з сабой, хаця і жывуць па-суседску. У іх вельмі падобная мінуўшчына і незайздросная сучасная сітуацыя. Адным словам, гэта краіны і народы вельмі нешчаслівыя.

Украіна — значна большая ад Беларусі дзяржава, больш шчодра надзелена прыроднымі рэсурсамі. Мае сваё цёплае мора, моцна ўраджайныя землі. Няраз я чуў ад кампетэнтных людзей, што сама Украіна можа пракарміць белым хлебам усю Еўропу. Багацейшыя і яе нетры.

Народ украінскі добры, працавіты, вольналюбівы, баявы. Над Украінай заўсёды лунаў дух казацкай вольніцы і патрыятызму. Украінцы вельмі любілі сваю краіну і ўсё ўкраінскае. На жаль, усё гэтае любілі на свой спосаб і бліжэйшыя, і далейшыя іх суседзі, апрача, канешне, казацкай вольніцы. Так любілі суседзі, што ўсімі сіламі стараліся заваяваць яе, навязаць украінцам свае парадкі і рэлігію і як найбольш высмактаць з яе. Вось і цэлымі стагоддзямі палала Украіна, стагнаў, праліваў сваю кроў украінскі народ — і ўсё без большых поспехаў. Савецкі час быў таксама не малінай. Сучаснае зло, па-мойму, адтуль і пачалося...

І раптам на Украіну, як і на Беларусь, і ў тым самым часе прыйшла „самастійнасць", незалежнасць, прыйшла сама. Як прынялі яе і карыстаюцца ёю беларусы, мы ўжо гаварылі — смехата адна. Не надта ведалі што з ёю рабіць і ўкраінцы. Пачаліся між імі разборкі, сваркі, рэлігійныя падзелы. Пышна расцвілі афёры і карупцыя. І так цэлых дваццаць гадоў — народ гібеў, а краіна пагружалася ў хаосе. Вось і маюць, што маюць.

Нядаўна пабачыў я дакументальны фільм аб тым, як з усяго свету кавалеры едуць на Украіну па жонкі-ўкраінкі. Загранічныя жаніхі ў асноўным брыдкія, прыстарэлыя, калекі, інвалыды, часта на інвалідных калясках. І жэняцца з маладымі, здаровымі прыгажунямі і вывозяць іх з сабой. Маладыя жонкі пакорна ідуць каля інвалідскіх калясак ці пхаюць іх перад сабою. Не з раскошы ж ці рамантыкі ўсё гэта, а з бяды, з бязвыхаднасці... А ў сёлетнім шостым нумары штотыднёвіка „Angora" надрукаваны цікавы артыкул: „Kto marzy o karierze prostytutki?". У ім мы чытаем:

„W Europie niemal co czwarta prostytutka jest Ukrainką. Z informacji ukraińskiego Instytutu Badań Społecznych wynika, że ponad 100 tysięcy Ukrainek handluje ciałem za granicą. W rzeczywistości te liczby są o wiele większe, bo przeważająca część Ukrainek przebywa za granicą nielegalnie.

Według informacji Międzynarodowej Organizacji do spraw Migracji (MOM), w ostatnich latach Ukraina wraz z Mołdową, Rosją, Albanią i Nigerią stała się liderem wsród dostawców zawodowych prostytutek w Europie. Z 750 tysięcy kobiet uprawiających tę profesję w Europie Zachodniej 23% są obywatelkami ukraińskimi. W branży usług seksualnych dziewczyny z krajów byłego ZSRR stanowią przeważającą większość — wyparły nawet Afrykanki i Azjatki...".

А яшчэ не так даўно ўсходнія славяне былі самым цнатлівым народам..

І матушка Расія — апошняя з тройцы нашых усходніх суседак. Яна велізарная, багацейшая сваімі ўраджайнымі землямі, лясамі, рыбнымі рэкамі, азёрамі, марамі, мільянерамі... і бедным расійскім народам.

Чаму ж бедным?! Гэта вынік неразумнай савецкай палітыкі. Была знішчана, між іншым, расійская сельская гаспадарка, сялянства. А традыцыйнае (не калгаснае) сялянства ў кожнай краіне з'яўляецца найбольш здаровай, найбольш працавітай і моцнай часткай грамадства, сяляне з маленства прывучаліся да цяжкай і адказнай працы на гаспадарцы. Прывучаны былі ставіцца да яе са знаннем, уменнем, любоўю і пашанай, бо зямлі не ашукаеш, а як пасееш — так і пажнеш. Дзякуючы менавіта такім адносінам расійская сельская гаспадарка мелася даволі добра, а ў многіх раёнах і вельмі добра, заможна.

Прыйшла савецкая ўлада і ўсю сельскую гаспадарку паставіла, як кажуць, з ног на галаву, фізічна знішчылі багацейшае патрыярхальнае сялянства, правялі калектывізацыю — і гэта быў пачатак канца традыцыйнай сельскай гаспадаркі і сялянства. Яно апынулася ў тупіку і дэфіцыце. Нават Палітбюро, калі хацела знішчыць нейкага свайго „таварыша", ставіла яго міністрам сельскай гаспадаркі, з патрабаваннем хутка паправіць яе. Вынік быў такі, што гэтая аграрная дзяржава штораз больш і больш сельскай прадукцыі змушана была купляць за граніцай. І так то скокам, то бокам аж да развалу Савецкага Саюза і сацыялізму.

У час трансфармацыі савецкаму кіраўніцтву было ўжо не да сельскай гаспадаркі, а як самім прыхапіць нейкі кусочак народнага багацця. Без дапамогі і прынукі многія калгасы разваліліся, а калгаснікі сталі беспрацоўнымі. Вось адкуль бяруцца бамжы, злодзеі і п'яніцы...

Часта чуем як расіяне са зменным шчасцем, але напорыста адзін за адным выпускаюць у космас свае складаныя апараты. Космас жа суровы, непрыязны і чужы чалавеку. І ніколі не будзе сваім і прыязным, але дзяржава не шкадуе на яго агромністых грашыскаў. А свая ўраджайная зямелька зарастае пустазеллем, бо не хапае на апрацоўку яе самых простых машын і няшчаснай саляркі. Дзе тут сэнс і дзе логіка?!.

Беларусь у геапалітычным плане

10 сакавіка ў Цэнтры навуковых даследаванняў у Ольштыне прайшоў сімпозіум пад лозунгам „Беларусь сёння"; аўдыторыю склала каля сарака слухачоў. Дакладчыкам быў Павел Вусаў з Магілёва, які зараз працуе ў Польскай акадэміі навук. Расказаў ён пра геапалітычныя канцэпцыі Расіі і яе палітыку адносна Беларусі.

Расія з'яўляецца зліццём славянскіх плямён і цюркскіх выхадцаў з туранскага Вялікага стэпу. Гэта не Еўропа і не Азія, толькі іншая цывілізацыя, якая ўключае пачаткі з абедзвюх крыніц. Вялікая Расія немагчымая без Беларусі і Украіны, таму адным з механізмаў утрымання ўплываў у былым СССР з'яўляецца падтрымка недэмакратычных рэжымаў у гэтых краінах. Расія, з аднаго боку, з'яўляецца палітычным гарантам лукашэнкаўскага рэжыму, а з другога пагражае ягонай палітычнай аўтаноміі. Для Расіі Лукашэнка з'яўляецца таксама гарантам захавання Беларусі ў сферы геапалітычных уплываў Расіі. Нягледзячы на канфлікты і „войны" — энергетычныя, цукровыя, малочныя — Беларусь астаецца ўдзельнікам усіх геастратэгічных праектаў Расіі. Выхад Беларусі з гэтай суполкі павёў бы за сабой вывад расейскіх ваенных баз з яе тэрыторыі. Зараз у Беларусі працуе радыёлакацыйная ўстаноўка „Волга" каля Ганцавіч і тэлекамунікацыйны цэнтр расійскага флоту ў Вілейцы; іх вывад з Беларусі быў бы для Расіі вялікім геапалітычным уронам. На працягу апошніх гадоў на тэрыторыі Беларусі ладзіліся комплексныя вайсковыя вучэнні з удзелам беларускіх і расійскіх фарміраванняў. Беларуская армія ўзброеная навейшымі расійскімі бронетанкавымі, авіяцыйнымі і зенітнымі сістэмамі. Зараз Беларусь намерваецца купіць у Расіі ўзбраенне за мільярд долараў, у тым ліку мабільную ракетную ўстаноўку „Іскандар".

Калі б Расія страціла Беларусь, яна аказалася б адчужанай ад Еўропы амаль азіяцкай дзяржавай. Інакш гаворачы, Беларусь з'яўляецца акном Расіі ў Еўропу і менавіта для Расіі Беларусь мае намнога большае значэнне чым для Еўропы. Таму Расія не зацікаўлена ў ніякіх зменах у Беларусі, якія памянялі б геапалітычны вектар апошняй. У 2010 годзе Расія нанесла шмат інфармацыйных удараў па Беларусі, аднак іх мэтай не было звяржэнне лукашэнкаўскага рэжыму, толькі прымушэнне яго да гаспадарчых і палітычных уступак, у тым ліку прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі; гэта падаецца магчымым па прычыне сітуацыі, у якой апынулася Беларусь пасля мінулагодніх прэзідэнцкіх выбараў.

Для самой Беларусі Расія астаецца зараз адзіным стратэгічным партнёрам; для прыкладу — 47% беларускага экспарту прымае Расія. Расія з'яўляецца таксама галоўным крэдыторам Беларусі, напрыклад, зараз Беларусь хадайнічае за 9 мільярдаў долаў крэдыту на будаўніцтва Астравецкай атамнай электрастанцыі. Разрыў партнёрства з Расіяй пагражаў бы дэстабілізацыяй цяперашняга палітычнага рэжыму ў Беларусі. Спробы паправы адносін Беларусі з Еўрасаюзам з'яўляюцца адно рэакцыямі на пахаладанне яе адносін з Расіяй, а не вынікам прадуманай палітыкі.

У час мерапрыемства выступіў таксама прафесар Аляксандр Краўцэвіч з Гродна, які гаварыў пра навейшыя падзеі ў Беларусі ды згадваў некаторыя эпізоды з ейнай гісторыі. Былы старшыня Саюза палякаў у Беларусі Тадэвуш Гавін расказаў пра справы тамашняй польскай меншасці.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Аўтар рубрыкі пра беларускі інтэрнэт Уладзімір Лапцэвіч быў затрыманы і арыштаваны ў Магілёве 25 сакавіка г.г. быццам за супраціў уладзе. Прысуд быў вынесены 28 сакавіка – сем сутак арышту.

С БЕЛАРУСІ

Бацька Нёман

Бадай няма ў нашай літаратуры ракі апяянай больш, чым Нёман. Рака ўслаўленая класікамі пісьменства адразу на некалькіх мовах — ад Элізы Ажэшкі да Якуба Коласа. Рака, што ўвайшла ў гісторыю ад старажытнага плытагоннага шляху да славутай дывізіі з назвай „Нармандыя-Нёман" часу Другой сусветнай вайны. Рака, якая злучае адразу некалькі частак былога Вялікага Княства Літоўскага. Рака, якую пераходзіў Напалеон і ў якую не раз уваходзілі немцы. Рака, якая дала жыццё тысячам адных людзей, і забрала ў тысячаў іншых. Рака, па адной з версій названая ў гонар магутнага бога Кронаса, паглынальніка часу. Як Кронан згадваў яе яшчэ старажытнагрэчаскі энцыклапедыст Клаўдзій Пталамей. Іншыя навукоўцы даводзяць, што гэты гідронім тлумачыцца як „хатняя рака". Менавіта на карысць гэтай трактоўкі і радкі з верша Адама Міцкевіча, які да ўсяго называў раку „радаводнай".

Нёман, адна з нямногіх вялікіх рэк, якая бярэ пачатак на тэрыторыі Беларусі. Нездарма яго называюць самай беларускай ракой. Нёманскі шлях працягласцю звыш 900 кіламетраў пачынаецца ў балоцістай лясістай мясцовасці Уздзеншчыны на вышыні 200 метраў над роўнем мора. Яго вытокамі з'яўляюцца дзве рачулкі — Нёманец і Лоша. Паводле даўняй легенды Нёманец і Лоша былі братам і сястрой. Аднойчы непаслухмяная Лоша ўцякла. Доўга шукаў яе брат, даганяў і ўрэшце знайшоў. У рэальнасці сапраўды два водныя ланцужкі спачатку разыходзяцца ў розныя бакі, каб потым зноў спаткацца і ўтварыць магутную паўнаводную раку. На гэтым месцы нават усталяваная адмысловая ганаровая табліца.

З дзяцінства запала мне ў памяць адна гісторыя ад бабулі пра тое, як помнік Сталіну ў ваколіцах Зблянаў быў затоплены менавіта ў Нёмане. Пазней давялося пачуць яшчэ некалькі падобных аповедаў пра іншыя месцы — „бацька народаў" знаходзіў сабе прыстанак у падводным чэраве іншага бацькі. Нёман і шматдзетны бацька ў сваім асноўным прызначэнні збірання водаў — да яго плывуць такія рознахарактарныя Уша, Бярэзіна, Котра, Гаўя, Вілія, Дзітва, Шчара, Рось, іншыя рэкі, кожная з якіх вартая асобнага апісання. Злучаны ён і са сваімі знакамітымі сваякамі: з Дняпром — Агінскім каналам, з Віслай — Аўгустоўскім.

Апошнія гады на Нёмане будуюць гідраэлектрастанцыю. Як звычайна ў нас да канца ўсе наступствы гэтага мегапраекта не пралічаныя. Людзі пагражаюць рацэ — рака пагражае людзям. Згодна з разлікамі шэраг вёсак будзе затоплена. „Нёман пад вачыма сонца", па якім некалі плылі караблі „з варагаў у грэкі", які быў крамянёвым і бурштынавым шляхам, які тысячагоддзямі карміў людзей рыбай, мог па шчодрасці сваёй „прырэзаць" ім кавалак зямлі, зараз у новую эпоху мусіць даваць электраэнергію. Цяжка сказаць, як гэта адаб'ецца на непрадказальным нораве ракі, якая зараз атрымала афіцыйны статус паўгорнай. Гісторыя памятае, як Нёман абрынаў Каложскую царкву, як заліваў розныя паселішчы, памятае ягоныя вірлівасць і крыгалом...

Чужынцы здаўна нявечылі і калечаць дагэтуль свядомасць беларусаў, змяняючы не толькі традыцыйныя парадкі, але і ўласныя імёны, назвы. Так што нават для многіх карэнных жыхароў Нёман страціў літару „ё" ў сваім корані і пайшоў у іншым „рэчышчы", стаў немым „Неманом". Прыкра, што гэтая заганная памылка як вынік русіфікацыі ўкараняецца і праз аднайменныя назвы спартовых клубаў, гарадскіх прадпрыемстваў.

І ўсё ж, як сказаў іншы паэт-класік, праз гады „нам маячыцца вёсачка, Нёман...".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гражына ЛУШЧЫК

Ёсць такая нацыя — студэнты

Лік студэнтаў з Беларусі ў Варшаўскім універсітэце працягвае заставацца высокім. Выбірае моладзь пераважна гуманітарныя дысцыпліны — міжнародныя адносіны, журналістыку, паліталогію, права, польскую філалогію ды шэраг бізнес-спецыяльнасцей — адміністрацыю, менеджмент, маркетынг. Студэнты польскага паходжання за навучанне не плацяць і ў пераважнай большасці атрымліваюць стыпендыю, якая, дарэчы, немалая як на студэнта. Здавалася б, не жыццё — маліна: вучыся сабе ў прэстыжнай ВНУ, атрымлівай грошы, падарожнічай па краінах Еўрасаюза (для тых, хто мае карту паляка, візы не трэба), ды дзівіся на прыўкрасы сталіцы. Аднак не ўсё так ружова, калі акунуцца ў глыбіні гэтай сістэмы. Як сказаў амерыканскі пісьменнік Эдгар Хау, „цяжка пераканаць студэнта, што ён яшчэ сутыкнецца з праблемамі болей складанымі чым алгебра і геаметрыя". Аднак будучы непасрэдна ў цэнтры студэнцкага варшаўскага жыцця, прадстаўляю кароткі агляд праблем, з якімі ўсё ж такі сутыкаюцца студэнты з Беларусі, прыехаўшыя па веды ў Варшаву.

Перш за ўсё моўны бар'ер. Будучы ў Беларусі, можна лічыць, што валодаеш польскай мовай дасканала, але ўжо на першых занятках разумееш, што памыляўся. Найбольш прыкрыя сітуацыі з майго асабістага вопыту звязаны з тым, што калі прафесар задае пытанне, ты ведаеш адказ, але сядзіш і маўчыш, як вады ў рот набраўшы, а ўсё таму, што ніяк не можаш падабраць адпаведныя словы, каб „аформіць" свае думкі. Ніякіх „ільгот" пры навучанні прафесары, зразумела, не робяць. „Студэнт ёсць студэнт", — кажуць. Вось і прыходзіцца круціцца ды вярцецца, каб не адстаць ад аднагрупнікаў.

Наступная праблема — хочаш не хочаш, а прыйдзецца знайсці агульную мову з камп'ютарам. Універсітэцкая Сістэма абслугоўвання студэнтаў (USOS), створаная, каб палегчыць студэнтам выкананне фармальнасцей, наадварот — стварае шэраг праблем. Усё тут робіцца праз інтэрнэт. Польская моладзь не наракае, кажуць, так лягчэй. Студэнтам з Беларусі прызвычаіцца няпроста. У першыя два месяцы ў мяне было ўражанне, быццам я размаўляю з камп'ютарам, таму што жывыя людзі, працаўнікі ўніверсітэта, па ўсіх пытаннях адсылаюць да інтэрнэт-старонак.

Кульгае таксама сістэма медыцынскага абслугоўвання студэнтаў. Студэнтам-іншаземцам, каб пайсці да доктара, трэба абавязкова мець страхоўку. Тут трэба прызнаць — студэтам з польскім паходжаннем аплачвае такую страхоўку ўніверсітэт. Аднак, каб яе атрымаць, патрэбны цэлы набор паперак — з польскага консульства ў Беларусі, з сакратарыята, з інтэрната, з бюро рэгістрацыі насельніцтва па месцы часовага жыхарства... Гэта часта выклікае незадавальненне ў студэнтаў, асабліва калі ты ўжо хворы, а цябе не могуць прыняць. Дарэчы, на праблемы, звязаныя з медыцыны, скардзяцца не толькі студэнты з Беларусі. Аднаму майму знаёмаму, які, не маючы польскіх каранёў, сам аплаціў страхоўку, адмовілі ў дапамозе таму, што ён не ведаў польскай мовы. Той факт, што ён прыйшоў у паліклініку ў мароз, з высокай тэмпературай, хіба не разглядаўся.

Безумоўна, вечная праблема, на якую працягваюць скардзіцца некаторыя студэнты з Беларусі, — гэта прыклеіўшаяся да іх этыкетка „рускія". Здавалася б, студэнты, людзі адукаваныя, аднак усё роўна ёсць такія, што працягваюць атаясамляць рускую мову з прыналежнасцю да рускага народа.

Варта ўспомніць яшчэ пра тугу па доме ды атмасферу вялікай сталіцы, у якой так лёгка разгубіцца. Аднак тут ужо ўсё індывідуальна.

Але Беларусь выхавала сваіх грамадзян цярплівымі, я б нават сказала, занадта цярплівымі, таму ніколькі не сумняюся, што цяперашнія студэнты, а ў будучым добрыя спецыялісты ў сваіх сферах, яшчэ пакажуць сябе і свае моцныя бакі на рынку працы.

У Кляшчэлях напрадвесні

Уладзімір СІДАРУК

Рашыў я з'ездзіць у Кляшчэлі, пацікавіцца цэнамі на рынку. Было гэта ў панядзелак 21 сакавіка. Як штогод, так і зараз, кірмаш напрадвесні быў мнагалюдны. Ад уязных варот па агароджу ў канцы пляцоўкі ўтварыўся вялікі затор. Паабапал брукаванага праезда стаялі ў шаэрэнзе прылаўкі крамнікаў з абуткам, вопраткай, гароднінай, прадуктамі і ўсім тым, што селяніну ў гаспадарцы спатрэбіцца. У канцы згуртаваліся земляробы са збожжам і парасятамі. Каля брамы пры ўваходзе прыкмеціў я сардэчнага прыяцеля, пчалавода з Бельска-Падляшскага Уладзіміра Зіневіча. Завялі гаворку.

— Як справа з мёдам маецца? — пытаю сябру.

— У мінулым годзе слабенька было, — адказаў прыяцель. — Паўплывала на гэта нястача корму ды паморак пчол. Але, дзякуй Богу, крышачку сабраў. На кліентаў не наракаю, бо ў мяне мёд добры, праўдзівы.

— Як цэніцца?

— За кілаграм падзевага, грачанага або акацыевага 40 зл. прашу. Рапсавы — таннейшы...

— Даўно пчалаводствам займаешся?

— Больш сарака пяці гадоў. Лічуся дыпламаваным майстрам пчалаводства, — кажа суразмоўца. — На практыку да мяне прыязджаюць вучні з Пчалаводчага тэхнікума з Пшчэлей Волі. Вучыцца ў ім таксама моладзь з Беласточчыны...

У ходзе далейшай размовы пчалавод выявіў, што родам ён з Сабятына. Там і ягоная пасека з больш чым дзевяноста вуллямі. А ў пчалярскай гаспадарцы памагае яму жонка Лідзія. Па прафесіі яна настаўніца, у Пасынках дзетак вучыла. Зіневічы маюць дзве замужнія дачкі: Еву і Іаланту ды чацвёра ўнукаў. Зяць Ірыней Красоўскі працуе настаўнікам у Бельскім белліцэі. Усе яны чытаюць „Ніву".

— А ты нічуць не змяніўся, — кідае пры развітанні мой субяседнік. — Прыязджай на свежы мёд у Сабятына. Мо сёлета лепш будзе!...

— Прыеду... Напэўна прыеду!

Паколькі я спяшаўся на цягнік, дык хуценька падаўся ў бок агароджы, дзе прадавалася збожжа. Шмат было фурманак са збожжам. Пшаніца цанілася па 95-100 зл. за цэнтнер, ячмень па 70 зл., авёс — 65 зл., а жыта — на пяць злотых менш. З таго, што я прыкмеціў, пакупнікоў было няшмат. Затое многа было фруктаў і гародніны. Яблыкі цаніліся па 2-2,50 зл. за кілаграм, а морква па 1,30 зл. Жанчыны куплялі насенне гародніны. Вядома, вясна набліжаецца. Час агародчыкі капаць!

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — ямайскую пагаворку.

1. травяністая трапічная расліна з шорсткім буйным лісцем (*Agave*) = 10 _ 20 _ 21 _ 22 _ 8 _;
2. доўгія тонкія асцюкі на каласах ячменю, жыта, пшаніцы = 4 _ 1 _ 26 _ 30 _;
3. рыцарава зброя = 15 _ 12 _ 7 _;
4. рыба сямейства ласосяў (*Coregonus autumnalis*) = 16 _ 5 _ 6 _ 9 _ 27 _;
5. ядомы пласціністы грыб з рыжай шапачкай (*Lactarius*) = 24 _ 25 _ 17 _ 2 _ 13 _;
6. побач воднай прасторы = 29 _ 28 _ 19 _ 18 _;
7. расійская аўтаномія, у якой крыніцы Енісея = 3 _ 14 _ 11 _ 23 _.

		1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13	14
			15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26	27
					28	29	30

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 9 нумара

Кунашыр, знак, Кувейт, ібіс, Сапега, лата, прас, Ясенін, куля, клець.

Рашэнне: **Без навукі і пастала не спляцеш.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбал і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

03.04 — 09.04

(22.03. — 20.04.) Не чакай лепшага часу, — якраз надыходзіць! Пераможаш кожную перашкоду, пручы ўперад як страла! У пары будзе іскрыцца, бо схочаш паставіць на сваім. Будзеш энергічны, баявіты, хутка здзейсніш свае намеры. Будзеш у цэнтры ўвагі.

(21.04. — 21.05.) Дынамічная цэлая першая палова красавіка. Бяры ўсё што да цябе прыходзіць. Дастанеш усё, аб чым марыш, поспех як рукой падаць. Афармляй самыя цяжкія справы. Пашчасціцца табе і то ў зусім неспадзяваным (да 21.04.). З 7.04. (да 11.04.) не дамаўляйся на рандэву ці важныя сустрэчы, перамовы.

(22.05. — 22.06.) Да 5.04. — час нялёгкіх выбараў, а нават расстанняў; пара развітацца з мінулым. Аж да 23.04. яшчэ не момант пачынаць новае. Некаторыя справы будуць ускладняцца, іншыя пойдуць уперад. Да 21.04. час спрыяльны для аўтапрамоцыі, паказвання добрых бакоў. Раней адкінутыя табою прапановы могуць стаць актуальнымі.

(23.06. — 23.07.) Працавіты ўвесь месяц! З 9.04. будзеш здольны да сапраўды вялікага! Крочыш простай дарогай да поспеху, смела змагайся за тое, аб чым марыш. Шукаючы кахання, не памылі яго з сяброўствам.

(24.07. — 23.08.) У першыя дні месяца хтосьці можа выкарыстаць нейкія інфармацыі супраць цябе. Да 6.04. Сатурн запаволіць твае дзеянні і прымусіць падагнаць хвасты; пакуль пойдзеш уперад, зробіш крок назад. Ды 4-10.04. — твае найшчаслівейшыя дні! Будзе з цябе біць фантан энергіі, падзейнічаеш з сапраўдным размахам.

(24.08. — 23.09.) Акалічнасці будуць мяняцца як у калейдаскопе; будзь больш гнуткім. 7-11.04. раптам можаш уключыцца ў змаганне на баку няслушнай справы. Аж да 23.04. будзь цярплівым — нават тваёй нязломнай волі не хопіць, калі акалічнасці не будуць спрыяць. Затое ўжо ў гэтым тыдні пераканаешся, што маеш шчасце ў каханні!

(24.09. — 23.10.) Нават на момант не страціш цвярозага стаўлення да жыцця. На працы не прымеш удзелу ў гонцы пацукоў, сваё зробіш у сваім тэмпе. Будзеш таямнічы і прываблівы. Ды з 7.04 (да 11.04.) можа папсавацца твой імідж; не мяняй у той час гардэробу на новы, не спакусіся на новую прычоску. А на горшы настрой найлепшая... праца!

(24.10. — 22.11.) Вельмі інтэнсіўны і шчаслівы месяц. Будзеш горача працаваць, гуляць і любіцца. Можаш ачараваць кожнага! З 8.04. будзеш прымушаны адбрахаць тое, што сказаў на чыюсь тэму! З 9.04. (да 13.04.) спакушаць цябе будзе рызыка і будзе табе здавацца, што маеш неабмежаваныя магчымасці. І ў той час не перамляйся работай, бо яшчэ расхварэешся! 3.04. можаш атрымаць прапанову, якую варта разважыць.

(23.11. — 22.12.) Пакажаш сваю баявітасць, энтузіязм і жыццярадаснасць. 4-8.04. уступяць у цябе новыя сілы. Ніхто цябе не зможа выбіць з раўнавагі і папсаваць твой настрой. Твае планы будуць набіраць канкрэтных кшталтаў. Ды пазіцыя Венеры і Юно (7-11.04.) паставіць цябе ў нявыгаднай сітуацыі, з якой не будзе добрага выхаду.

(23.12. — 20.01.) Будзе цябе ганяць то сюды, то туды, ды не страціш цвярозасці. Можаш зрабіць добры інтарэс, нечакана атрымаць грошы. Ды можаш праваронiць добры шанц — твая неабгрунтаваная боязь перашкодзіць табе ў поспеху.

(21.01. — 19.02.) Неспакойны месяц, ды справішся з усім! 04-08.04. інтуіцыя падкажа табе дарогу. Не паддайся перашкодам, тым больш дробным! Фрустрацыя можа ператварыцца ў неўтаймаваную злосць; да 6.04. некаторыя справы пойдуць у кепскім напрамку, ды гэта ж не твая віна.

(20.02. — 21.03.) Скрышыш крыгі і знойдзеш свой шлях. Лёгка развінеш свае таленты. Урэшце адчуеш, што цябе любяць, паважаюць і цэняць. Рыбы, якіх чакае хірургічная працэдура: будзьце спакойнымі, асабліва калі аперацыя будзе пасля поўні Месяца.

Агата АРЛЯНСКАЯ

УШАНАВАЛІ НЕЗАЛЕЖНУЮ БЕЛАРУСЬ

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Удзельнікі святкавання Дня Незалежнасці ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім і Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы салідарызаваліся з маладымі людзьмі ў Рэспубліцы Беларусь, якія, так як і ў мінулых гадах, ушаноўваюць Акт 25 Сакавіка, не зважаючы на паслядоўнасці з боку праваахоўных органаў (затрыманні, арышты і ночы праведзеныя ў вязніцах).

Адзін з плакатаў, выкананых бельскімі белліцэістамі ў рамках конкурсу „Беларусь у маіх вачах”

Гайнаўскія белгімназісты сваімі выступамі ўвялі сабраных ва ўзнёслы настрой

Адзначанне 93-х угодкаў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі распачалося ў Бельску-Падляшскім 11 сакавіка, ад сустрэчы ліцэістаў з маладзёвым актывістам і грамадскім дзеячам з Беларусі Франкам Вячоркам.

— Ідэя спаткання з Франкам Вячоркам выйшла ад саміх вучняў і ладзілася нашым Клубам беларуска-польскіх спраў. Я лічу важным, што мы, настаўнікі, не навязваем ліцэістам ідэі святкавання, але яны самі разумеюць і бачаць патрэбу адзначання Дня Незалежнасці. Нашыя ліцэісты з вялікай увагай слухалі выказванні Франка Вячоркі, а ён сам патрапіў вельмі займальна расказваць вучням пра рэчаіснасць у Беларусі, — сказаў дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк. — Мы ў рамках святкаванняў на ўроках беларускай мовы і гісторыі знаёмілі вучняў з гістарычнымі падзеямі 1918 года, якія давялі да абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі і з паслядоўнасцямі гэтага рашэння. Найбольш нацыянальна свядомыя вучні дасканала разумеюць і ведаюць таксама пра цяперашнія падзеі ў Беларусі, дзе многія маладыя людзі, амаль іх равеснікі, былі арыштаваныя, бо хочуць жыць у нармальнай дзяржаве.

Вучні трэціх класаў Бельскага белліцэя самі пашылі бел-чырвона-белыя сцягі і ў дзень 25 Сакавіка хадзілі з імі па бельскіх вуліцах з воклічам „Жыве Беларусь!”, уцягваючы ў святкаванне таксама жыхароў Бельска. Над уваходам у школьны будынак луналі бел-чырвона-белыя сцягі, а ўсярэдзіне былі расклеены плакаты са святочнымі матывамі, прымеркаванымі да 25 Сакавіка.

— Некаторыя людзі спыняліся і здзіўляліся, што мы на вуліцы выгуквалі лозунг „Жыве Беларусь!”, — сказаў белліцэіст, які выйшаў на горад з беларускім гістарычным сцягам. У гэты дзень святкаванні ў школе распачаліся ад турніру, у якім прынялі ўдзел вучні першых класаў. Маладыя беларусы спаборнічалі ў спартыўных гульнях, спявалі гімн Бельскага белліцэя „Люблю наш край...”, прэзентавалі загадзя выкананыя плакаты „Беларусь у маіх вачах”, выступалі з інсцэніроўкамі беларускай народнай казкі, дэкламавалі вершы або спявалі песні пра свой клас і прымалі ўдзел у конкурсе ведаў пра Беларусь. Пасля падвядзення вынікаў аказалася, што перамаглі вучні I „б” і I „д” класаў.

— Сёння вялікае свята для ўсіх, хто адчувае сябе беларусам, — гаварылі бельскія белліцэісты.

У тым часе, калі праходзіў турнір, вучні другіх класаў спаткаліся са старшынёй аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах” Дарафеем Фіёнікам, які расказаў пра бежанства, з беларускай пісьменніцай і журналісткай Мірай Лукшай, якая запрэзентавала м.інш. сваю кніжку „Жывінкі з глыбінкі”, ды журналістам Радыё „Беласток” і старшынёй Звязу беларускай моладзі Міхасём Сцепанюком, які распавядаў пра беларускія арганізацыі ў Польшчы і журналісцкае рамяство. Аднак асноўнай задачай другакласнікаў была падрыхтоўка рэгіянальных беларускіх страў, якія прэзентаваліся на другім паверсе школы.

— З дапамогай бацькоў мы падрыхтавалі многа посных страў, хаця ёсць і мясныя, — заявілі дзяўчаты з II „б” класа і паказалі на прыгожа прыбраны і застаўлены смакоццямі стол. Звярнулі яны ўвагу на нашую рэгіянальную кухню — бульбяную кішку, аладкі, ці свой пірог. Дарафей Фіёнік заявіў, што складаным было выкананне аўсянога кісялю, бо спатрэбілася на гэта некалькі дзён.

— Мы павышаем свае кулінарныя здольнасці, вяртаемся да нашых традыцый і вучымся спаборнічаць, — сказала Эва Лаеўская, якая ў час прэзентацыі страў пускала беларускую музыку.

— Трэба вяртацца да нашай гісторыі, нашых традыцый і ў нашай беларускай школе святкаваць 25 Сакавіка, — гаварыла Наталля Лаўранюк.

— Мы ведаем пра падзеі ў Беларусі, памятаем пра маладых беларусаў з-за мяжы і спачуваем, што ім складана святкаваць Дзень Незалежнасці, — заявіў Павел Васілюк.

— Я веру, што Беларусь зменіцца. Мяне нават не цікавіць хто канкрэтна будзе там правіць, але мне хацелася б, каб Беларусь была беларускай дзяржавай, каб беларуская мова была там у пашане, — заявіў дырэктар Андрэй Сцепанюк. — Нам таксама будзе лепш, калі ў Беларусі можна будзе святкаваць Дзень Незалежнасці так як у нас.

Конкурсная камісія вырашыла, што ўсе класы, якія рыхтавалі стравы, атрымаюць першыя месцы, і адначасна размеркавала ўзнагароды. Вучні II „б” і II „ц” класаў мелі самі выбраць дзень, у які настаўнікі не будуць браць у іх іспыты, а вучням II „а” і II „д” класаў такі дзень мелі выбраць настаўнікі. Бельскія белліцэісты глядзелі таксама беларускія фільмы, падабраныя вучнямі Клуба беларуска-польскіх спраў і разам з настаўнікамі рашыліся паехаць на больш маштабныя святкаванні Дня Незалежнасці ў Беластоку, арганізаваныя Радыё „Рацыя”, нашым тыднёвікам і Беларускім саюзам у РП.

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы святкаванні 25 Сакавіка белгімназісты і белліцэісты наладзілі ў час урачыстых лінеек. Распавялі яны пра славутыя гістарычныя падзеі 1918 года, дэкламавалі патрыятычныя вершы і спявалі вайсковыя, патрыятычныя песні, а таксама прэзентавалі беларускія музычныя матывы. Больш падрабязна вучні знаёміліся з гістарычнымі падзеямі, якія спадарожнічалі абвяшчэнню БНР, на ўроках беларускай мовы.

— Трэба святкаваць 25 Сакавіка, каб людзі не забылі, што быў такі час, калі Беларусь стала незалежнай, а людзі маглі гаварыць на беларускай мове ў якасці дзяржаўнай, — заявіла Магдалена Панасюк з III „б” класа белгімназіі.

— Мы шчаслівыя, што маглі сёння святкаваць. Пра гістарычныя падзеі вучыліся таксама на занятках беларускай мовы і думаем, што ў 1918 годзе ў Беларусі было замала сіл, каб утрымаць незалежнасць і супрацьстаяць савецкай дзяржаве, — кажуць гайнаўскія белгімназісты — Мы хацелі на чатыры галасы праспяваць гімн „Магутны Божа”, але частка з нас захварэла і таму толькі адслухалі яго з магнітафона.

— Мы рашыліся на лінейку, каб моладзь адчула ўзнёслы і ўрачысты характар святкавання. Вучні III „б” класа нашай белгімназіі арганізавалі святочную лінейку год назад і ўжо з восені прасілі, каб і сёлета маглі ладзіць свята 25 Сакавіка, а я прыняла прапанову добраахвотнікаў, — заявіла апякунка гімназістаў, настаўніца беларускай мовы Анна Каліноўская.

У час выступаў моладзі гайнаўскай школы ўрачысты настрой узмацнялі беларускія нацыянальныя сімвалы — герб „Пагоня” і бел-чырвона-белы сцяг, што лунаў побач вучняў. „Пагоня” і беларускі гістарычны сцяг увесь час знаходзяцца таксама над уваходнымі дзвярыма ў актавую залу, дзе адбывалася ўрачыстасць. Гайнаўскія белліцэісты з I „а” класа, што выступілі перад сваімі сябрамі, таксама атрымалі гарачыя апладысменты.

— За такое святкаванне, што адбываецца ў нас, на Беларусі можна дастаць дубінкай па спіне, а нават аказацца ў зняволенні. Мы павінны цешыцца, што можам свабодна святкаваць 25 Сакавіка, — сказала настаўніца беларускай мовы Іаланта Грыгарук, апякунка белліцэістаў, якія падрыхтавалі лінейку і выступілі перад сябрамі.

Дырэктар Яўген Сачко падзякаваў вучням за напамін аб падзеях, якія спадарожнічалі абвяшчэнню Беларускай Народнай Рэспублікі і ўвялі сабраных ва ўзнёслы настрой.

— Частка ідэй, за якія змагаліся беларусы ў 1918 годзе, актуальная і сёння. Зараз у Беларусі ў вялікіх гарадах амаль няма школ, дзе вялася б адукацыя на беларускай мове. Калі на Беларусі ёсць сёння такая цудоўная моладзь, як у нас, то дачакаемся, што будзе беларуская мова дзяржаўнай (сапраўды — А. М.) і ўсе будуць вучыцца на беларускай мове, — заявіў пасля выступлення вучняў дырэктар Яўген Сачко.

У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім таксама штогод ладзяцца „лінейкі” з нагоды святкавання Дня Незалежнасці, хаця не заўсёды адбываюцца яны якраз 25 сакавіка.

— У нашай школе якраз у гэтым тыдні гарачы час. Праходзілі між іншым раённыя элімінацыі конкурсу „Роднае слова”, ладзіліся спартыўныя спаборніцтвы і трэба было выязджаць з нашымі вучнямі, пераможцамі прадметных конкурсаў, у Беласток і таму ў нас галоўная ўрачыстасць з нагоды Дня Волі пераложана на наступны тыдзень, — заявіў настаўнік беларускай мовы Андрэй Мароз.

Пра падзеі 1918 года і абвяшчэнне незалежнасці Беларусі настаўнікі беларускай мовы размаўлялі з вучнямі раней на занятках беларускай мовы. У час урачыстай лінейкі гімназісты з „тройкі” будуць таксама распавядаць пра 25 Сакавіка, будуць выступаць з патрыятычнымі вершамі, а дзяўчаты са школьнага калектыву, якім апякуецца настаўніца Анна Вярцінская, праспяваюць беларускія песні.

— Штогод ладзім святкаванні абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, каб вучні памяталі пра нашае нацыянальнае свята. У гэтым годзе, рыхтуючы вучняў да выступаў, карысталіся мы, між іншым, матэрыяламі з „Нівы”, — сказаў настаўнік Андрэй Мароз, які разам з настаўнікам Яраславам Падольцам займаліся з гімназістамі, што выступілі на лінейцы. Настаўніца беларускай мовы Валянціна Бабулевіч запрасіла ў „тройку” вучняў з Беластока, якія 24 сакавіка выступілі перад белгімназістамі са спектаклем „Ой даўно, даўно”.

ISSN 0546-1960